ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 29 (992) | Субота, 17 ліпеня 1954 года | Цана 50 кап.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Першая старонка.

Перадавы. — Гордасць рускай літаратуры.
Чэхаўскія дні ў рэспубліцы.
Ю. Багушэвіч. — На спартыўныя тэмы.

Другая старонка.

Г. Шчарбатаў. — Тып — гэта з'ява эпохі.
П. Шаблінскі. — Недахопы цікавага твора.
Ажывіць работу рэдкалегій.

Трэцяя старонка.

Я. Брыль. — Неўміручы мастак.
І. Папоў. — Хвалюючая сустрэча.
Т. Хадкевіч. — Узор майстэрства.

Чацвёртая старонка.

А. Бестужаў. — Спектакль вялікага выхаваўчага значэння.
Я. Цікоцкі. — Канцэрты балгарскіх артыстаў.
М. Ларчанка. — Зборнік вершаў Я. Аношкі.

Гордасць рускай літаратуры

Шырока і ўрачыста адзначаюць совецкія людзі і прагрэсіўная грамадскасць свету пяцідзесяцігоддзе з дня смерці слаўнага сына рускага народа, геніяльнага майстра мастацкага слова — Антона Паўлавіча Чэхава. Чэхаўскія дні з асаблівай красамоўнасцю пасведчылі, наколькі глыбокая і шчырая любоў людзей самых розных нацыянальнасцей да пісьменніка, творчасць якога з'явілася буйным крокам у мастацкім развіцці чалавецтва. Кнігі, выдадзеныя за гады совецкай улады саракамільённым тыражом, перакладзеныя на 68 моваў народаў нашай бацькаўшчыны, п'есы, якія не сыходзяць са сцэн тэатраў і самадзейных сцэн, — хіба гэта не зайздросны лёс мастака, не адзнака яго ўсенагульнага прызнання і вядомасці, яго бліскучай славы!

Гэта быў чалавек, сэрца якога поўнілася вялікім замілаваннем да роднай Расіі, да яе шматпакутнага працоўнага народа і вялікай нянавісцю да марнатраўцаў, што паразітамі сядзелі на шыі чалавека працы, жывіліся яго потам і крывёю. «...Калі памрэ Чэхаў,—пісаў у 1900 годзе А. М. Горкі, — памрэ адзін з лепшых сяброў Расіі, сябра разумны, справядлівы, праўдзівы, — сябра, які любіць яе, спачувае ёй ва ўсім, і Расія ўся здрыганецца ад гора і доўга не забудзе яго, доўга будзе вучыцца разумець жыццё па яго пісаннях, асветленых журботнай усмешкай любячага сэрца, па яго апавяданнях, прасякнутых глыбокім веданнем жыцця, мудрай справядлівасцю і спагадай да людзей, не жалем, а спагадай разумнага і чулага чалавека, які ўсё разумее».

У суровую, змрочную пару ў гісторыі Расіі жыў і тварыў А. П. Чэхаў. У краіне лютаваў царызм, які душыў усё перадавое, прагрэсіўнае. Тупая фанатычная паліцэйшчына, бяздушнае чыноўніцтва верна служылі царскаму самадзяржаўю, вынішчаючы ўсякія праявы вольналюбства, робячы працоўнага чалавека бяспраўным, абяздоленым, занядбаным.

Сын свайго народа, Чэхаў выступіў як змагар з ладам эксплуататараў і душыцеляў простых людзей, у абарону іх чалавечых правоў, іх чалавечай годнасці.

Безліч карцін галечы, гаротнага жыцця працоўнага люду намаляваў у сваёй творчасці пісьменнік. Са здзіўляючай мастацкай сілай і пераканальнасцю стварыў ён цэлую галерэю вобразаў людзей — і дарослых, і дзяцей, — якія крывавым мазалём здабываюць сабе кавалак хлеба, якія ўвесь век жывуць у нястачах і цемры, чэзнуць і марнеюць на непасільнай працы. Прыгадаем, да прыкладу, герояў цудоўных чэхаўскіх твораў «У яры», «Ванька», «Мужыкі», «Спаць хочацца» і многіх, многіх іншых.

Падаючы жахлівыя карціны напоўгалоднага існавання абяздоленых людзей, расказваючы іх сумныя жыццёвыя гісторыі, Чэхаў прыводзіў чытача да думкі, што грамадства, у якім магчыма такое жыццё і такое становішча чалавека, павінна быць скасавана, знішчана і заменена іншым, справядлівым грамадствам. Праўда, сам пісьменнік не ведаў канкрэтных шляхоў да ліквідацыі царскага самадзяржаўя, выразна не разумеў, што толькі рэволюцыя прынясе народу шчаслівае свабоднае жыццё.

Героі Чэхава мараць аб надыходзе такога часу, калі чалавек здабудзе сабе светлую долю, калі ён вольна будзе дыхаць на зямлі. Яны глыбока ўпэўнены, што час такі абавязкова надыйдзе. «Рыхтуецца, — гаворыць герой п'есы «Тры сястры», — здаровая, моцная бура, якая ідзе, ужо блізкая і хутка здзьмухне з нашага грамадства ляноту, абыякавасць, прадузятасць да працы, гнілы сум».

Чалавек з пранікліваым розумам, А. П. Чэхаў адчуваў, што на Расію насоўваецца ачышчальная бура, якая разгоніць удушлівую атмасферу тагачаснай рэчаіснасці. І пісьменнік шчыра радаваўся гэтаму. Нездарма многія чэхаўскія героі, вуснамі якіх гаварыў аўтар, так ірвуцца ў светлую будучыню, так горача вераць у яе прыход.

За набліжэнне гэтай светлай будучыні Чэхаў змагаўся ўсёй сваёй творчасцю.

Ён глыбока ненавідзеў прыгнёт чалавека чалавекам, цемрашальства, паліцэйшчыну, мяшчанства, невуцтва, так характэрныя для Расіі таго часу. І пісьменнік даў свету творы, дзе бязлітасна, са знішчальным сарказмам высмеяў агіднасці ў соцыяльным жыцці краіны 80—90 гадоў мінулага стагоддзя. Выкрывальная сіла многіх чэхаўскіх апавяданняў — надзвычайная, і яны заслужана занялі пачэснае месца ў шэрагу шэдэўраў сусветнай літаратуры. Класічнымі ўзорамі сатыры вялікага грамадскага гучання могуць служыць такія перлы мастацкай творчасці пісьменніка, як «Чалавек у футляры», «Унтэр Прышыбееў», «Хамелеон». Імёны герояў гэтых апавяданняў даўно ўжо зрабіліся назоўнымі і жывуць у народзе. Не раз да іх звярталіся правадыры рэволюцыі В. І. Ленін і І. В. Сталін, змагаючыся з контррэволюцыянерамі, апартуністамі і іншымі ворагамі народа. І сёння гэтыя чэхаўскія героі дапамагаюць нам весці барацьбу з рэшткамі белікаўшчыны, прышыбееўшчыны, хамелеоншчыны, з перажыткамі ліхога мінулага ў свядомасці людзей.

Ці можа быць вышэйшай ацэнка пісьменніка, як тое, што вынікі яго працы народ бярэ на сваё ўзбраенне!

Чэхаў — геніяльны мастак слова, які ўмеў з вялікай дакладнасцю ў дасканалай форме выказаць свае думкі, увасобіць сваю задуму. Ён старанна шліфаваў кожную фразу, кожнае слова, бязлітасна адкідваючы ўсё лішняе, непатрэбнае, што замінае ў творы, пакідаючы толькі самае неабходнае, самае выразнае.

Першае патрабаванне, з якім Чэхаў звяртаўся да літаратараў і якому сам быў верны ўсё сваё жыццё, — быць праўдзівым у творчасці, пісаць праўду. «... Мастацкая літаратура, — пісаў ён у адным са сваіх пісьмаў, — таму і называецца мастацкай, што малюе жыццё такім, якое яно ёсць на самай справе. Яе прызначэнне — праўда безумоўная і сумленная. Звужваць яе функцыі такою спецыяльнасцю, як здабыванне «зерняў», гэтак-жа для яе смяртэльна, як калі-б вы прымусілі Левітана маляваць дрэва, загадаўшы яму не чапаць бруднай кары і пажаўцелага лісця».

Для таго-ж, каб пісаць праўду, пісьменнік мусіць глыбока ведаць жыццё. Талент, паводле слоў Чэхава, не выратуе твора ад няўдачы, калі ў аўтара няма ведання жыцця, калі ён дасканала не вывучыў тое, пра што збіраецца апавядаць. У творы павінна быць ясная, акрэсленая задума, ясная, акрэсленая ідэя, — толькі тады ён атрымаецца цэласным, мастацкі завершаным.

Надзвычай павучальная чэхаўская мова. Простая, на першы погляд — вельмі ўжо звычайная, яна разам з тым — лексічна багатая і шматгранная, дакладная і яркая, мілагучная і прыгожая. Цудоўна сказаў пра мову вялікага мастака Максім Горкі: «Ён не гаворыць новага, але тое, што ён гаворыць, атрымліваецца ў яго здзіўляюча пераканальна і проста, да жаху проста і ясна, неабвержна правільна. І потым, мова яго заўсёды ахінута ў надзіва прыгожую і таксама да наіўнасці простую форму, і гэтая форма яшчэ ўзмацняе значэнне мовы. Як стыліст, Чэхаў недасягальны, і будучы гісторык літаратуры, гаворачы пра рост рускай мовы, скажа, што мову гэтую стварылі Пушкін, Тургенеў і Чэхаў».

А. П. Чэхаў справядліва лічыцца непераўзыйдзеным майстрам кароткага апавядання, магчымасці якога ён так поўна раскрыў і якое ўзняў на небывалую вышыню.

І да гэтага часу здзіўляе і захапляе нас непаўторная чэхаўская драматургія, яго цудоўныя наватарскія п'есы, якія абышлі сцэны многіх краін свету.

Вялікі рускі пісьменнік рабіў і робіць дабратворнае ўздзеянне на прагрэсіўную сусветную літаратуру. Многія зарубежныя літаратары адчулі на сабе гэта ўздзеянне і з удзячнасцю гавораць пра геній Чэхава.

Імя Антона Паўлавіча Чэхава неадрыўна ад гісторыі рускай літаратуры, ад гісторыі совецкай культуры.

Геніяльны мастак жыве і сёння, жыве ў шчаслівым грамадстве вольных людзей, пра якое ён так горача марыў.

Чэхаўскае слова дапамагае нам будаваць наша шчасце.

Чэхаўская творчасць з'яўляецца для совецкіх пісьменнікаў, у тым ліку і для беларускіх, узорам служэння свайму народу, узорам служэння роднай бацькаўшчыне.

БЕЛАРУСКІ ПАВІЛЬЁН

Здалёк відаць скульптура калгаснікі, якая высока ўзняла сноп і вянок. Скульптура ўстаноўлена на чатырохгранай вежы Беларускага павільёна. На карнізе замацаван дэкаратыўны шчыт з пазалочаным гербам рэспублікі і сцягамі. У цэнтры фасада — ордэн Леніна — гаваровая ўзнагарода, атрыманая рэспублікай у 1935 годзе за дасягненні ў развіцці сельскай гаспадаркі.

Хутка павільён Беларускай ССР, як і ўсе астатнія павільёны Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі, гасцінна сустрэне шматлікіх наведвальнікаў.

Фото **Н. Граноўскага.** (Фотахроніка ТАСС).

Чэхаўскія дні ў рэспубліцы

ЮБІЛЕЙНЫ ВЕЧАР

15 ліпеня ў памяшканні Рускага драматычнага тэатра БССР пісьменнікі, дзеячы навукі і мастацтва, рабочыя прадпрыемстваў сталіцы ўшанавалі светлую памяць вялікага рускага пісьменніка Антона Паўлавіча Чэхава.

Жывыя кветкі акаймоўваюць партрэт пісьменніка, устаноўлены на сцэне. Лічбы «1904—1954» напамінаюць прысутным аб тым, што поўстагоддзя назад намёр палымяны патрыёт Радзімы, гуманіст, таленавіты мастак слова А. П. Чэхаў.

Па даручэнню праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Рэспубліканскага камітэта абароны міру вечар, прысвечаны пяцідзесяцігоддзю з дня смерці геніяльнага рускага мастака, адкрыў Пятро Глебка.

Даклад аб жыцці і творчай дзейнасці А. П. Чэхава зрабіла кандыдат філалагічных навук Л. Фіглоўская.

З чыткай перакладаў твораў Чэхава на беларускую мову выступілі Я. Брыль, А. Якімовіч, Т. Хадкевіч.

У заключэнне вечара тэатр імя Леніна скага комсамола БССР паставіў спектакль па п'есе А. П. Чэхава «Чайка», які быў цёпла сустрэты прысутнымі.

СЕСІЯ АКАДЭМІІ НАВУК БССР

6 ліпеня адбылася юбілейная сесія Акадэміі навук БССР, прысвечаная 50-годдзю з дня смерці вялікага рускага пісьменніка А. П. Чэхава.

Даклад «А. П. Чэхаў — вялікі рускі пісьменнік» зрабіў прафесар М. Дабрынін. Кандыдат філалагічных навук Ф. Куляшоў прачытаў даклад «А. П. Чэхаў аб мастацкім майстэрстве». З дакладам па тэму «Праблема станоўчага героя ў драматургіі А. П. Чэхава» выступіла старшы выкладчык Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя В. І. Леніна З. Мелкіх.

НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Паводле дадзеных кніжнай палаты БССР, кнігі А. П. Чэхава выдаваліся ў Беларусі 23 разы, агульным тыражом у 271 тысячу экземпляраў. Усяго выпушчана на беларускай мове 18 кніг Чэхава.

У бліжэйшы час Дзяржаўнае выдавецтва БССР выпускае на беларускай мове аднатомнік «Выбраных твораў» пісьменніка пад рэдакцыяй Я. Брыля. Творы А. П. Чэхава пераклалі для аднатомніка К. Крапіва, Я. Брыль, І. Шамякін, Я. Маўр, І. Гурскі, Ул. Шахавец, А. Якімовіч, А. Кулакоўскі, І. Грамовіч, А. Рылько і іншыя беларускія пісьменнікі.

Выдадзены таксама кароткі нарыс З. Мелкіх аб жыцці і творчасці вялікага рускага пісьменніка.

У КАЛЕКТЫВАХ САМАДЗЕЙНАСЦІ

Творы А. П. Чэхава карыстаюцца вялікай папулярнасцю сярод удзельнікаў мастацкай самадзейнасці рэспублікі. У праграме канцэртаў даволі часта сустракаюцца аднаактовыя п'есы, гумарыстычныя апавяданні пісьменніка.

Больш за ўсё з твораў Антона Паўлавіча на сцэне самадзейных тэатральных калектываў ставяцца спектаклі па аднаактовых п'есах і інсцэніраваных апавяданнях. Многія калектывы паказалі спектаклі «Прапанова», «Юбілей», «Мядзведзь» і іншыя. У кожным раённым, гарадскім і абласным аглядах тэатральнай самадзейнасці ёсць пастаноўкі па творах Чэхава.

Заслугоўваюць станоўчай ацэнкі такія спектаклі, як «Прапанова» (драматычныя калектывы Полацкай сярэдняй сельскагаспадарчай школы, Мядзельскага раённага Дома культуры Маладзечанскай вобласці, Брэсцкага клуба чыгуначнікаў і інш.), «Юбілей» (драматычны калектыў аблпромсаюза, г. Брэст), «Лебядзіная песня» (у пастаноўцы драматычнага калектыва завода імя Мяснікова, Мінск) і інш.

У гэтыя дні многія калектывы рыхтуюць аднаактовыя п'есы, інсцэніраваныя апавяданні і гумарыстычныя творы пісьменніка.

Тэатральныя калектывы сталіцы паказваюць на вечарах, прысвечаных Чэхаву, спектаклі «Ноч перад судом» (Будтрэст № 4), «Мядзведзь» (завод «Ударнік») і іншыя.

На жаль, мы яшчэ не можам пахваліцца спектаклем па многаактовых п'есах пісьменніка. Лепшым самадзейным тэатральным калектывам рэспублікі (клуба аўтазавода, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, клуба чыгуначнікаў імя С. М. Кірава, ст. Орша) неабходна папоўніць свой рэпертуар п'есамі «Вішнёвы сад», «Чайка», «Дзядзя Ваня». Пастаноўка чэхаўскіх п'ес яшчэ вышэй узніме майстэрства выканання самадзейных калектываў.

В. СТАНКЕВІЧ.

ПАМЯЦІ ВЯЛІКАГА ПІСЬМЕННІКА

У хаце-чытальні Хутарскага сельсавета Чэрвенскага раёна адбыўся літаратурны вечар, прысвечаны А. П. Чэхаву. Даклад аб жыцці і дзейнасці вялікага рускага пісьменніка зрабіла выкладчыца рускай мовы і літаратуры Хутарскай сярэдняй школы А. Чэркас.

Драмгурток хаты-чытальні паказаў спектакль па п'есе А. П. Чэхава «Мядзведзь».

В. ЛЫЗО.

На спартыўныя тэмы

Усесаюзны дзень фізкультурніка

Заўтра — Усесаюзны дзень фізкультурніка. У сталіцы нашай Радзімы — Маскве адбудзецца фізкультурны парад, у якім будзе ўдзельнічаць вялікая дэлегацыя беларускіх спартсменаў.

Гэты дзень беларускія юнакі і дзяўчаты сустракаюць новымі дасягненнямі ў працы і спорце.

Новыя рэкорды рэспублікі

На бегавую дарожку кіеўскага стадыёна выйшлі чатыры стройныя дзяўчыны. Яны павінны былі спаборнічаць у бегу на 80 метраў. Блізка перад сабой бачылі яны працягнутую фінішную стужку. Аднак на гэтым кароткім адрэзку перад імі стаяла восем бар'ераў, якія трэба было пераадолець як мага хутчэй.

Першай сярод мацнейшых бар'ерыстак Совецкага Саюза на фінішы была мінчанка, майстар спорту Яўгенія Гурвіч. Яна прабегла 80 метраў з бар'ерамі за 11,2 секунды. Гэта — новы рэкорд Беларусі, які з'яўляецца другім вынікам у Еўропе.

За апошні месяц беларускія спартсмены дамагліся раду выдатных спартыўных рэкордаў.

Своеасаблівы спартыўны паядынак адбыўся паміж двума беларускімі скараходамі, майстрамі спорту Кудравым і Ягоравым. Канстанцін Кудраў на мінскім стадыёне «Дынамо» прайшоў 10 кілометраў за 43 хвіліны 29,4 секунды. Гэты час з'явіўся новым беларускім і ўсесаюзным рэкордам па спартыўнай хадзе. Праз некалькі дзён у сталіцы Украіны — Кіеве другі беларускі майстар спорту — Анатоль Ягораў змог паказаць яшчэ лепшы час у хадзе на 10 кілометраў. Ён прайшоў гэтую адлегласць за 43 хвіліны 19,8 секунды, што з'яўляецца новым беларускім і ўсесаюзным рэкордам.

Мінскі майстар спорту Марыя Іткіна з'яўляецца самай хуткай спартсменкай Беларусі. Яна гэта даказала, двойчы за некалькі дзён палепшыўшы рэкорд у бегу на сто метраў сярод жанчын. Спачатку яна прабегла гэту дыстанцыю за 12 секунд, а затым — за 11,9 секунды.

Аднак найбольш выдатным вынікам за апошні месяц быў рэкорд мінчаніна Уладзіміра Іванова. У лёгкаатлетычных практыкаваннях адным з самых складаных з'яўляецца трайны скачок з разбегу. У гэтым відзе лёгкай атлетыкі рэкорд Беларусі належаў да гэтага года гомельскаму майстру спорта Злотнікаву і раўняўся 14 метрам 90 сантыметрам. Нядаўна на спаборніцтвах мінскіх спартсменаў выпускнік Беларускага інстытута фізкультуры Уладзімір Іваноў зрабіў трайны скачок на адлегласць 15 метраў 10 сантыметраў. Гэта новы рэспубліканскі рэкорд. Уладзімір Іваноў увайшоў у лік мацнейшых спартсменаў свету.

Вялікага поспеху дамогся мінскі дзесяціборац Фёдар Лістапад. Ён набраў у суме дзесяці відаў лёгкай атлетыкі 7.361 ачко — на 812 ачкоў больш ранейшага беларускага рэкорда. Звычайна лічыцца, што рубеж 7 тысяч — рубеж высокага міжнароднага спартыўнага майстэрства. Фёдар Лістапад першы з беларускіх спартсменаў, які перавысіў гэты высокі спартыўны рубеж.

Ю. БАГУШЭВІЧ.

Ва Усесаюзным камітэце па правядзенню 50-годдзя з дня смерці А. П. Чэхава

Аб мерапрыемствах па увекавечанню памяці А. П. Чэхава ў сувязі з 50-годдзем з дня яго смерці

У сувязі з 50-годдзем з дня смерці вялікага рускага пісьменніка А. П. Чэхава, якое споўнілася 15 ліпеня 1954 года, Лопасненскі раён Маскоўскай вобласці, дзе жыў і працаваў А. П. Чэхаў, перайменаваны ў Чэхаўскі раён і рабочы пасёлак Лопасня пераўтвораны ў горад Чэхаў.

Прысвоена імя А. П. Чэхава:

— бібліятэцы № 64 Свярдлоўскага раёна г. Масквы;

— сярэдняй школе № 2 г. Таганрога.

У доме № 6 па Садова-Кудрынскай вуліцы ў г. Маскве, дзе жыў А. П. Чэхаў, адкрыты Дом-музей А. П. Чэхава і будзе ўстаноўлена на гэтым доме мемарыяльная дошка.

Міністэрствам культуры СССР будзе выдадзена ў 1954 — 1956 гадах збор твораў А. П. Чэхава ў 12 тамах.

Палепшыць культурнае абслугоўванне калгаснікаў

У пастанове чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС «Аб выніках вясенняй сяўбы, догляду пасеваў, аб падрыхтоўцы да ўборкі ўраджаю і забяспечанні выканання плана нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў у 1954 годзе», ў пастанове апошняга Пленума ЦК КПБ значная ўвага аддадзена задачам разгортвання масава-палітычнай і культурна-асветнай работы на вёсцы.

Пленум ЦК КПСС указаў на неабходнасць «скарыстаць друк, радыё, кіно, культурна-асветныя ўстановы, усе формы масава-палітычнай работы з тым, каб забяспечыць актыўны ўдзел у сельскагаспадарчых работах усіх калгаснікаў і калгасніц, рабочых МТС, соўгасаў і ўсяго сельскага насельніцтва».

Мастацкія калектывы і культурна-асветныя ўстановы набылі значны вопыт у культурнай рабоце сярод калгаснікаў і сельскай інтэлігенцыі. Вучоныя, дзеячы мастацтва, работнікі кіно і радыё, члены Таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў выступалі ў раённых і сельскіх клубах, у дамах культуры, а таксама непасрэдна перад калгаснікамі ў брыгадах і палявых станах з лекцыямі і гутаркамі на надзённыя тэмы, канцэртамі і пастаноўкамі, з дэманстрацыяй сельскагаспадарчых фільмаў.

Актыўны ўдзел у гэтай высакароднай справе прынялі беларускія тэатры. Так, тэатр імя Янкі Купалы яшчэ да летніх гастролей паказаў на вёсцы больш за восемдзесят спектакляў, якія наведалі 35 тысяч гледачоў. Частымі гасцямі ў калгасах, соўгасах і машынна-трактарных станцыях з'яўляюцца артысты тэатраў імя Якуба Коласа і імя ЛКСМБ, абласныя драматычныя тэатры, а за апошні час — і салісты тэатра оперы і балету.

Варты ўхвалення пачын рэспубліканскага рускага тэатра, які за час гастролей у Нікалаеве некалькі разоў сустракаўся з украінскімі калгаснікамі і азнаёміў іх са сваімі пастаноўкамі «Варвары», «Кароль Лір» і іншымі.

Для палепшання мастацкай якасці выязных спектакляў некаторыя тэатры падрыхтавалі спецыяльныя дэкарацыі. Цікавы вопыт набылі агітбрыгады, удзельнікамі якіх з'яўляюцца калектывы мясцовай мастацкай самадзейнасці.

Аднак было-б няправільным спыніцца на першых кроках мастацкага абслугоўвання вёскі. Важнейшая задача дзеячоў прафесійнага і самадзейнага мастацтва, клубаў і хат-чыталень у цяперашні перыяд сельскагаспадарчых работ — яшчэ больш узмацніць культурнае абслугоўванне калгаснікаў і работнікаў МТС непасрэдна на палявых станах і ў вытворчых брыгадах.

Удумліва павінны быць арганізаваны выезды прафесійных тэатральных калектываў. Апрача дасканалай падрыхтоўкі спектакляў, якія паказваюцца калгаснікам, і сапраўды патрабавальнага адбору высокаякаснага рэпертуара, вельмі важна скарыстоўваць творчыя сустрэчы з калгаснікамі, механізатарамі МТС і аграномамі для сур'ёзнага абмеркавання ідэйнай і мастацкай якасці пастановак, для разгортвання прынцыповых дыскусій на тэмы аб сувязі нашага мастацтва з жыццём.

Заслугоўвае падтрымання ініцыятыва тэатра імя Янкі Купалы, які дапамог абсталяванню сцэны ў клубе калгаса імя М. І. Калініна Рудзенскага раёна (Мінская вобласць). Гэта тым больш важна, што некаторыя прафесійныя мастацкія ўстановы (асабліва тэатр оперы і балету і часткова філармонія) усё яшчэ не наладжваюць для работнікаў сельскай гаспадаркі спектаклі (у канцэртным выкананні) і выступленні сімфанічнага аркестра. Філармонія і оперны тэатр абгрунтоўваюць сваю пасіўнасць у гэтай галіне адсутнасцю адпаведных памяшканняў, прыстасаваных для работы буйных прафесійных калектываў.

Значнага палепшання патрабуе і работа Белдзяржэстрады. Эстрадныя брыгады сталі даволі частымі гасцямі сельскіх клубаў і дамоў культуры. Але, на жаль, усё яшчэ не задавальняе калгаснікаў іх рэпертуар, у якім няма твораў совецкіх пісьменнікаў, новых песень беларускіх прафесійных і самадзейных кампазітараў.

Многа карыснага ў культурным абслугоўванні вёскі можа зрабіць мастацкая самадзейнасць, якая, аднак, патрабуе значна большай увагі да сябе з боку рэспубліканскага і абласных дамоў народнай творчасці.

Вельмі добра, што Рэспубліканскі Дом народнай творчасці гэтымі днямі накіраваў з Мінска групу прафесіяналаў-спецыялістаў у дапамогу сельскім калектывам Гомельскай, Магілёўскай, Брэсцкай і Гродзенскай абласцей. Але вельмі шкада, што надзённы рэпертуар для іх высылаецца з вялікім спазненнем. Увогуле ў Рэспубліканскім доме народнай творчасці ўсё яшчэ не пераадолена канцылярскае кіраўніцтва мастацкай самадзейнасцю, адсутнічае пастаянная жывая сувязь з калектывамі.

Усесаюзны фестываль сельскагаспадарчых фільмаў, якія прагледзелі каля трыццаці мільёнаў людзей, паказаў выключную цікавасць насельніцтва да гэтай галіны сельскагаспадарчай прапаганды. Але нельга дапусціць, каб пасля заканчэння фестываля паказ фільмаў зменшыўся.

Абласныя і раённыя аддзелы культуры абавязаны паклапаціцца аб тым, каб рэгулярна чыталіся лекцыі і гутаркі на тэмы міжнароднага і гаспадарчага жыцця, каб клубы, хаты-чытальні сістэматычна папаўняліся новай навукова-тэхнічнай і мастацкай літаратурай, каб памяшканні бібліятэк і чыталень, чырвоных куткоў на палявых станах былі афармлены з добрым густам наглядная агітацыяй.

Немалаважную ролю ва ўздыме культурнага жыцця совецкай вёскі адыгрывае радыё. Але, на жаль, у праграмах сельскагаспадарчай рэдакцыі Галоўнага ўпраўлення радыёфікацыі Міністэрства культуры БССР яшчэ багата сумнага, нецікавага і мала такіх перадач, дзе аб вельмі важным для работы на вёсцы можна было-б паслухаць у вобразнай, жывой форме. Шмат яшчэ належыць зрабіць і ў палепшанні радыёфікацыі культурных устаноў і дамоў калгаснікаў.

Уся наша краіна, увесь совецкі народ актыўна ўдзельнічаюць у справе новага ўздыму соцыялістычнай сельскай гаспадаркі. Вялікая роля ў гэтым належыць дзеячам культуры і мастацтва, якія ўсю сваю энергію і веды таксама павінны аддаваць паспяховаму вырашэнню важнейшай усенароднай задачы — паспяховай уборцы новага ўраджаю.

Да III з'езда пісьменнікаў Беларусі

Тып—гэта з'ява эпохі

□
Г. ШЧАРБАТАЎ
□

У асяроддзі літаратараў напярэдадні з'езда ідуць гарачыя спрэчкі аб праблеме станоўчага героя. Пры гэтым часта спрэчкі вядуцца вельмі агульна, схаластычна, бо крытыкі нярэдка забываюць аб шматгадовым вопыце савецкай літаратуры і яе сусветна-гістарычных здабытках.

Гаварыць аб праблеме станоўчага героя — гэта значыць гаварыць аб слаўным шляху савецкай літаратуры, аб яе высокай ідэйнасці і партыйнасці. Лепшыя творы нашай літаратуры ўзяты на ўзбраенне народа, яны цалкам адпавядаюць інтарэсам народа, інтарэсам будаўніцтва комунізма ў нашай краіне.

На кніжных паліцах мільёнаў савецкіх людзей можна знайсці «Узнятую цаліну» М. Шолахава, «Разгром» і «Маладую гвардыю» А. Фадзеева, «Як гартавалася сталь» Н. Астроўскага, «Аповесць аб сапраўдным чалавеку» Б. Палявога, «Далёка ад Масквы» В. Ажаева, «Васілія Цёркіна» А. Твардоўскага, «Дрыгву» Я. Коласа і многа іншых твораў. А што гэта значыць? Гэта значыць, што лепшыя творы савецкай літаратуры карыстаюцца велізарнай папулярнасцю ў народа, што ідэі і вобразы нашай перадавой літаратуры сугучны думам і справам савецкіх людзей. Многія станоўчыя вобразы кніг савецкіх пісьменнікаў сталі пэўнымі тыпамі, якія ўвасабляюць у сабе лепшыя рысы нашага народа, яго адданасць Комуністычнай партыі, яго высакароднасць, мужнасць, непахіснасць у барацьбе за пабудову лепшай будучыні. Хто не ведае і хто не захапляецца такімі тыпамі літаратурных твораў, як Чапаеў, Павел Карчагін, Левінсон, Аляксей Мерэс'еў, Батманаў, Васіль Цёркін, дзед Талаш! Яны сталі дарагімі і блізкімі для мільёнаў чытачоў таму, што пісьменнікі, ствараючы гэтыя вобразы, выходзілі з праўды жыцця, змаглі ўзняцца на вялікую вышыню пры абагульненні лепшых рыс характару савецкіх людзей. Малюючы жыццё ў рэвалюцыйным развіцці, у няспынным руху і зменах, лепшыя савецкія пісьменнікі паказалі сваіх герояў у барацьбе з перажыткамі мінулага свету», у пераадоленні ўсякіх цяжкасцей і перашкод.

Станоўчы герой савецкай літаратуры— гэта сам наш народ, будаўнік новага жыцця, тварэц найвялікшых у свеце здабыткаў эканомікі і культуры. І савецкія пісьменнікі лічаць за вялікі гонар адлюстраваць рост гэтага героя, яго багаты душэўны свет, вялікую волю ў працы, невычарпальную ўпэўненасць у перамозе комунізма.

Аднак трывога пісьменнікаў і чытачоў з поваду станоўчага героя ў літаратуры ўсё-ж мае свае падставы. І яшчэ больш такіх падстаў мае чытач нашай рэспублікі. У пасляваенны час у беларускай літаратуры вельмі мала з'явілася твораў, у якіх станоўчы герой паўстаў-бы на поўную моц, з'явіўся-б тыпам эпохі пасляваеннага аднаўлення і паступовага пераходу нашай краіны ад соцыялізма да комунізма.

Мы не раз адзначалі пэўныя поспехі беларускай прозы. І сапраўды, беларускія празаікі стварылі шэраг актуальных і цікавых твораў. Важнейшыя падзеі жыцця нашай рэспублікі — яе індустрыяльнае будаўніцтва, аднаўленне сельскай гаспадаркі, рост нацыянальнай інтэлігенцыі— так ці інакш знайшлі сваё адлюстраванне ў літаратуры. Усё гэта так. Але спытайцеся ў чытача, каго з герояў беларускай літаратуры ён узяў сабе за прыклад, хто стаў яго настаўнікам у жыцці?

Чаму-ж многія, добра акрэсленыя вобразы твораў нашай літаратуры не сталі яркімі абагульняючымі тыпамі? Тлумачыцца гэта, мне здаецца, не толькі маладосцю нашай прозы, хоць гэта ў некаторай меры мае сваё значэнне, але і слабым веданнем жыцця, няправільным разуменнем некаторых літаратурных прыёмаў.

Бывае-ж і так, што пісьменнік добра вывучыць жыццё, умела раскрые псіхалогію людзей, аднак пэўных тыпаў, якія-б засталіся, як з'ява сваёй эпохі, у творы не атрымліваецца.

Мне здаецца, што некаторыя нашы пісьменнікі няправільна разумеюць патрабаванне соцыялістычнага рэалізма аб перавелічэнні станоўчых рыс герояў твора. Яшчэ ўсё бытуе такая думка, што нібыта пісьменнік мае права завастраць, перавялічваць толькі якасці адмоўнага персанажа. А між тым М. Горкі не раз падкрэсліваў, што пісьменнік, абапіраючыся на шырокае веданне рэчаіснасці, мае права «дапаўняць данае магчымым і жадаемым». «... Другімі словамі, — гаварыў М. Горкі ў пісьме да А. Шчэрбакова, — мастацтва соцыялістычнага рэалізма мае права перавялічваць — «дадумваць». У гутарцы з маладымі ўдарнікамі, якія прыйшлі ў літаратуру, у прадмове да кнігі А. Вінаградава «Тры колеры часу» М. Горкі зноў і зноў гаворыць аб прадбачанні пісьменніка, аб неабходнасці для стварэння тыпаў вялікіх абагульненняў.

Перавялічваць — гэта не значыць нешта выдумваць. Перавялічваць — гэта значыць бачыць «магчымае і жадаемае» на аснове глыбокага ведання рэчаіснасці, на аснове паказу жыцця ў яго няспынным развіцці. М. Горкі гаворыць, што «інтуітыўнае нельга разумець як нешта папярэднічаючае ведам, «прароцкае», яго даваршае вопыт у тых выпадках, калі вопыту, які арганізуецца як гіпотэза або як вобраз, — нехапае нейкіх звенняў, прыватнасцей».

Як-жа беларускія пісьменнікі карыстаюцца правам на перавелічэнне? Возьмем, да прыкладу, цікавы раман М. Паслядовіча «Святло над Ліпскам». Раман вызначаецца праўдзівым паказам пасляваеннага аднаўлення сельскай гаспадаркі. Галоўны герой рамана старшыня калгаса Дзямід Сыч — гэта чалавек са своеасаблівым характарам, з моцнай воляй і цвёрдай напорыстасцю ў дасягненні мэты. Іменна такі чалавек — з ясным розумам, мэтанакіраваны, прынцыповы — і мог стаць сапраўдным тыпам, які-б увасобіў у сабе рысы ўсіх перадавых хлебаробаў нашай рэспублікі і стаў сапраўдным узорам для іх і ў працы, і ў жыцці. Аднак гэтага не здарылася.

М. Паслядовіч не выкарыстаў права на перавелічэнне станоўчых якасцей героя. Перад чытачом то паўстае любіцель адміністрыравання, які не жадае лічыцца з думкамі сваіх калгаснікаў, то ініцыятыўны, удумлівы кіраўнік, нястомны змагар за ўсё перадавое ў сельскай гаспадарцы. Вядома, пісьменнік мае права маляваць вобраз станоўчага героя з усімі яго супярэчнасцямі, і ад гэтага вобраз можа быць толькі больш шматгранны і больш цікавы. Але гэта ніяк не азначае, што пісьменнік не павінен імкнуцца найбольш поўна, найбольш акрэслена выявіць іменна станоўчыя якасці свайго героя, выявіць іх так, каб яны сталі прадметам пераймання. Хіба не дае наша рэчаіснасць цудоўных прыкладаў, якія заслугоўваюць усенароднага адабрэння і пераймання? Чаму-ж М. Паслядовіч, ствараючы вобраз перадавога чалавека нашай эпохі, не ўзняў яго станоўчыя якасці на патрэбную вышыню, не тыпізаваў іх? Пісьменнік, як відаць, вельмі захапіўся прататыпам героя, адным са старшынь калгасаў рэспублікі, і не змог шырока абагуліць многія выдатныя рысы нашых сучаснікаў. Вобраз аказаўся прыземлены, аўтар не дапоўніў убачанае магчымым, жадаемым, не напоўніў яго жыццё вялікім грамадскім пафасам.

У пацверджанне можна прывесці і такія прыклады. Ужо сённяшняе жыццё апярэджвае самыя «смелыя» планы Дзяміда Сыча. Аб чым ён марыць? «У «Перамозе» ён узніме ўсе дзірваны, зноў засадзіць знішчаны акупантамі сад, нагадуе сотні галоў жывёлы. Каб чалавек, ступіўшы сёння на папялішчы, не жадзён быў заўтра кавалку хлеба, скварцы сала, яблыку, гурку. Каровы «Перамогі» будуць даваць па пяць тысяч літраў малака, коні калгаса будуць лепшыя ў вобласці. Электрычнае святло ўспыхне на малочнай ферме, на канюшні, у кожнай хаце». Вось і ўсё. Далей ужо праз увесь раман ідзе дэталізацыя гэтага плана. Трэба аддаць справядлівасць Дзяміду Сычу: ён з жалезнай няўхільнасцю змагаецца за выкананне намечанай праграмы і дабіваецца значных поспехаў.

«А што-ж далей?» — часта думаў Дзямід Сыч. Гэтае пытанне непакоіць і чытача. Сапраўды, аб чым-жа далей думаць гаспадару калгаса, як планаваць сваю будучыню? На жаль, на гэта пісьменнік не дае пэўнага адказу. У думках Сыча такі адказ выглядае, як вельмі агульнае рашэнне. «Тут Дзямід Сыч разам успомніў Генька і яго сябра... Ён павінен жыць і працаваць для іх шчасця, для іх будучыні». Такі адказ не задавальняе нас. Гэта азначае, што пісьменнік не зазірнуў у будучыню нават на 5—7 год. А калі-б ён гэта зрабіў, думкі яго галоўнага героя набылі-б канкрэтны змест. Ён убачыў-бы пераўтварэнне ўсёй сельскай гаспадаркі на аснове індустрыялізацыі, убачыў-бы новую, рашаючую ролю машынна-трактарных станцый у справе ўздыму калгаснай вытворчасці.

Характар героя фарміруецца ў барацьбе за новае, перадавое. Гэта разумее кожны пісьменнік. Справа ў тым, як падыходзіць пісьменнік да паказу гэтай барацьбы, наколькі глыбока ён паказвае сутыкненні герояў, як адпавядае гэты паказ праўдзе жыцця. Канфлікт твора можа быць сапраўды вострым толькі ў тым выпадку, калі страсці герояў дасягаюць высокага накалу, калі барацьба з перашкодамі вядзецца з усёй рашучасцю і прынцыповасцю.

Нельга сказаць, што Дзямід Сыч не вядзе ніякай барацьбы з адсталымі людзьмі калгаса. Ён непрымірымы да гультаёў і абібокаў, да парушальнікаў Статута сельгасарцелі. Але гэта барацьба праходзіць вельмі спакойна, без вастрыні і напружанасці. Ствараецца ўражанне, што ў асяродзі калгаснікаў няма ўжо адсталых людзей, што ліквідаваны ўсе перажыткі капіталізма ў іх свядомасці. На самай справе гэта зусім не так. Вядома, якую вялікую работу праводзіла ў першыя пасляваенныя гады і вядзе цяпер наша партыя па выхаванню калгаснага сялянства, па ліквідацыі капіталістычных перажыткаў. М. Паслядовіч чамусьці не адважыўся завастрыць і адмоўныя вобразы рамана, завастрыць з тым, каб бязлітасна іх развянчаць, выпаліць агнём сатыры іх шкодную ідэалогію. Адмоўныя вобразы «Святла над Ліпскам» не змаглі стаць тыпамі, бо пісьменнік пабаяўся перабольшання адмоўных рыс іх характару. Дарожны майстра Дарафей Несенька, які, на думку пісьменніка, павінен быў з'явіцца носьбітам адсталых настрояў, акрэслены аўтарам вельмі невыразна і па сутнасці з'яўляецца слабым праціўнікам Дзяміда Сыча.

Бяскрыласць, прыніжанасць, аднабаковасць вобразаў характэрны і для іншых твораў пасляваеннай беларускай літаратуры. Некаторыя пісьменнікі паказваюць жыццё сваіх герояў, як няспынны ланцуг надзённых спраў, не асвятляюць яго вялікай комуністычнай ідэяй. З такіх твораў не даведаешся, што-ж натхняе людзей на працоўныя подзвігі, якімі ідэаламі яны жывуць, што думаюць аб цудоўнай будучыні нашай краіны. Прыкладам можа служыць раман А. Стаховіча «Шырокія гарызонты», аб заганах якога ўжо не мала гаварылася.

Стварэнне пэўнага тыпу літаратуры патрабуе вялікіх жыццёвых назіранняў і высокага літаратурнага майстэрства. М. Горкі гаварыў, што «тып — гэта з'ява эпохі». Такім чынам, пісьменнік праз свайго героя павінен паказаць самае характэрнае з той ці іншай эпохі, раскрыць ідэі, якія рухалі грамадства, вывесці пэўныя грамадскія ідэалы, гэта значыць ствараць тыповыя характары ў тыповых абставінах. Гэта задача патрабуе ўмення абагульняць з'явы і характары, умення «дапаўняць данае магчымым», прадбачыць. На жаль, нават лепшыя творы сучаснай беларускай літаратуры не вызначаюцца смеласцю і шырынёй абагульненняў.

Возьмем раман І. Шамякіна «У добры час». Твор па заслугах сустрэў прыхільныя водгукі чытачоў і літаратурнай грамадскасці. Раман падкупае праўдзівасцю і пераканаўчасцю ў паказе жыцця двух калгасаў. Вобразы асноўных герояў намаляваны даволі рэльефна, даны ў развіцці. Кожны вобраз мае свой адметны характар. І ўсё-ж І. Шамякіну нехапіла сілы абагульнення, каб стварыць тып савецкага чалавека, які прайшоў горніла Вялікай Айчыннай вайны і цяпер з новай энергіяй будуе мірнае жыццё. Пісьменнік не змог адабраць найбольш характэрныя рысы дэмабілізаваных воінаў, каб абагуліць іх у адным характары. Галоўны герой твора Максім Лескавец — вельмі супярэчлівая натура. Жыццё гэтага чалавека як-бы замкнута ў асабістых перажываннях, якія не маюць грамадскага значэння. І хоць аўтар умела раскрывае перажыванні Лескаўца, вядзе яго праз цяжкасці і перашкоды, характар яго ўсё-ж не стаў той вышэйшай нормай характару, якая робіць мастацкі вобраз пэўным літаратурным тыпам, нашым ідэалам.

Нейкіх звенняў нехапае і ў абмалёўцы вобразаў Машы Кацубы і Ігната Ладыніна. Пісьменнік ярка падае духоўны свет гэтых людзей, прыгажосць іх душы, напорыстасць у працы, высакародства іх мар. Аднак усяго гэтага аказалася недастаткова, каб паставіць гэтыя вобразы ў адным радзе з мацнейшымі тыповымі характарамі савецкай літаратуры. І тут пісьменнік, як відаць, таксама недастаткова выкарыстаў права на перавелічэнне станоўчага героя, мяркуючы, што дастаткова стварыць вобраз, адпаведны яго прататыпу, вобраз жыццёва апраўданы і свежы, каб ён загучаў ужо, як пэўны тып.

Майстэрства пісьменніка заключаецца ва ўменні тыпізацыі з'яў і характараў, у шырокіх абагульненнях. Чым лепш ведае пісьменнік жыццё, чым ён глыбей прасякнуўся пафасам савецкай рэчаіснасці, тым у яго больш назіранняў, тым больш глыбокія вывады ён можа зрабіць. Метад соцыялістычнага рэалізма дае савецкаму пісьменніку безліч рознастайных прыёмаў для мастацкага вырашэння той ці іншай тэмы. Адным з іх з'яўляецца перавелічэнне рыс станоўчага героя.

Увага дакументальным фільмам

З вялікай цікавасцю сустракаюць гледачы кожны новы мастацка-дакументальны фільм. Гэтыя фільмы маюць вялікае навукова-пазнавальнае значэнне. Разам са стваральнікамі фільма мы можам пабываць сярод ільдоў Арктыкі, абыйсці ўсе нашы гарады, падарожнічаць па музейных залах. Дакументальны фільм дапамагае нам яшчэ больш пазнаць прасторы нашай неабсяжнай Радзімы, раскрывае тайны прыроды, гісторыю народа, паказвае жыццё за рубяжом.

Але вельмі часта немагчыма праглядзець новы дакументальны фільм. Як правіла, у Гомелі кінотэатры займаюцца паказам такіх фільмаў толькі ў дзённыя сеансы. Так, у кінотэатры імя Калініна чэхаславацкі фільм «Афрыка», які выклікае вялікую цікавасць, дэманструецца ў малой зале толькі першыя тры сеансы: у 11, 13, 15 гадзін. А большасць гледачоў, у якіх рабочы дзень заканчваецца ў 18 гадзін, карціну паглядзець ужо не можа.

Другі недахоп у паказе дакументальных фільмаў — гэта слабая рэклама. Звычайна выхаду на экран новага мастацкага фільма папярэднічае добра аформленая каляровая рэклама, якая выклікае цікавасць гледачоў. А пры дэманстрацыі дакументальнага фільма абмяжоўваюцца шэрай афішкай, напісанай неахайна.

А варта праводзіць перад дэманстрацыяй дакументальных фільмаў уступныя лекцыі, арганізоўваць у памяшканні кінотэатраў фотавыстаўкі. Гэта арганічна дапаўняла-б фільм.

Упраўленню кінофікацыі Міністэрства культуры БССР трэба звярнуць больш увагі на тое, каб дакументальна-мастацкія фільмы даходзілі да шырокіх мас гледачоў.

Г. КАПЦЕЛАЎ.

Гомель.

Мінск. Новы шматкватэрны дом па вуліцы імя Калініна.

Гастролі тэатра імя ЛКСМБ

Ужо другую дэкаду праходзяць у нашай сталіцы гастролі Дзяржаўнага тэатра імя Ленінскага комсамола Беларусі. З пачатку гастролей тэатр паказаў «Брэсцкую крэпасць», «Гады вандраванняў», «Дон Сезар дэ Базан», «Вясельнае падарожжа».

Найбольшым поспехам у мінчан карыстаецца спектакль «Брэсцкая крэпасць», які прагледзела ўжо каля 4-х тысяч чалавек. Тэатр паказаў свае спектаклі таксама працоўным Заслаўя, Жодзіна, Барысава, рабочым цагельных заводаў, у доме адпачынку «Ждановічы» і г. д. 17-га ліпеня пры актыўнай дапамозе Лагойскага РК КПБ і раённага аддзела культуры тэатр арганізуе прыезд калгаснікаў для прагляду спектакля «Брэсцкая крэпасць».

Намечаны рад творчых сустрэч з рабочымі прадпрыемстваў Мінска.

Юбілейныя чэхаўскія дні тэатр адзначыў паказам п'есы «Чайка».

Тэатр праводзіць таксама вялікую работу па падрыхтоўцы новага рэпертуара. У пачатку жніўня будзе пастаўлена п'еса А. Астроўскага «Не было ні гроша, ды раптам алтын» (рэжысёр І. Багданаў).

П'есу К. Сіманава «Гісторыя аднаго кахання» ставіць рэжысёр — заслужаны артыст БССР Г. Волкаў.

Тэатр намячае ў канцы сваіх гастролей, якія працягнуцца да 8-га жніўня, шырокае творчае абмеркаванне спектакляў на агульнагарадской канферэнцыі гледачоў.

Л. ПАУЛАУ.

На канферэнцыях самадзейных кампазітараў

На абласных канферэнцыях самадзейных кампазітараў Гомельшчыны і Маладзечаншчыны праслуханы і абмеркаваны новыя музычныя творы, праведзены семінарскія заняткі па тэарэтычных пытаннях.

На канферэнцыях было выканана 50 музычных твораў для хораў, салістаў-спевакоў і інструменталістаў. Звяртае на сябе ўвагу адпаведны ўзровень літаратурных тэкстаў, якія напісаны пачынаючымі паэтамі абласцей, а таксама імкненне самадзейных кампазітараў пісаць на актуальныя тэмы. У значнай колькасці былі прадстаўлены песні і частушкі, якія напісаны на ўласныя тэксты, індывідуальныя і калектыўныя (А. Шоскін, Т. Лапаціна і іншыя).

З твораў, якія пакідаюць больш значнае ўражанне, трэба адзначыць песню «Калі мяне любіш» В. Пракошына (тэкст М. Танка), лірычную польку для баяна таго-ж аўтара, «Сабраліся хлеборобы» Н. Бяспалава (тэкст Барскага), «Наша калгаснае сяло» (калектыва пад кіраўніцтвам Т. Лапацінай), песні для маленькіх дзяцей (на словы Саконскай) А. Мечыслаўскага, «Комсамольскі марш» (тэкст В. Рэймерыс) і «Едзе любы каля лесу» (тэкст А. Русака) Ф. Наумчыка, «Палессе» (словы П. Броўкі) А. Чараднічэнкі і некаторыя іншыя. У гэтых творах адчуваецца жыватворны ўплыў народнай песеннасці, арыгінальная кампазітарская думка.

І. НІСНЕВІЧ.

Новы атрад бібліятэчных работнікаў

У гэтым годзе сто шаснаццаць выпускнікоў Мінскага бібліятэчнага тэхнікума імя А. С. Пушкіна атрымалі назначэнне на работу ў раённыя і сельскія бібліятэкі рэспублікі. Пяць выпускнікоў падалі заявы аб накіраванні іх на работу ў раёны асваення цалінных і залежных зямель Казахстана.

У бліжэйшыя дні ў тэхнікуме адбудзецца выпуск студэнтаў чацвёртага курса завочнага аддзялення.

А. АЛІН.

КАРЭЛА-ФІНСКІЯ АРТЫСТЫ У ВІЦЕБСКУ

У Віцебск прыбыў танцавальны калектыў Дзяржаўнага ансамбля песні і танца Карэла-Фінскай ССР «Кантэле» — лаўрэат Сусветнага фестывалю моладзі ў Берліне.

Учора ў парку культуры і адпачынку імя Фрунзе адбыўся першы канцэрт. Працоўныя Віцебска цёпла сустрэлі выступленне творчага калектыва брацкай рэспублікі.

Чытачы аб літаратуры

Недахопы цікавага твора

Новы твор А. Кулакоўскага — раман «Расстаемся ненадоўга» — малюе падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Хочацца выказаць некалькі думак, якія ўзніклі ў мяне пры чытанні другой часткі рамана.

Не за кожным учынкам і дзеяннем герояў рамана можна разгледзець канкрэтную асобу. Іншы раз абставіны, у якія ставіць аўтар сваіх герояў, дрэнна ўвязваюцца з уласцівасцямі і асаблівасцямі іх характару.

Возьмем, напрыклад, прабыванне Анны Сцяпанаўны ў Варонежы і яе шлях з Варонежа да месца працы (IV-ы раздзел). Уявім на хвіліну замест Анны Сцяпанаўны Веру. Калі адкінуць непакой Анны Сцяпанаўны аб стаптаных туфлях і яе ўспаміны, усё астатняе тут магло-б без ніякіх змен звязвацца з вобразам Веры. Што можна даведацца аб рысах чалавечай асобы з такіх вось падрабязнасцей, якія запаўняюць узятую намі частку тэкста:

«І далучылася да клапатлівых, энергічных людзей на тратуары, якія ўсе некуды спяшаліся і спяшаліся. Ішла і думала, што вось пачынаецца нешта новае ў жыцці».

Або:

«Ехала туды Анна Сцяпанаўна дзе на конях, дзе на валах. Не мала давялося пранцы і пехатою. Па дарозе сустракалася многа вёсак, многа горак, многа лагчын і яраў. Некалькі разоў находзілі хмаркі і шугаў дождж. Некалькі разоў Анна Сцяпанаўна вымакала да ніткі і зноў высыхала. І калі пасля апошняга дажджу сустрэчныя людзі сказалі, што за наступнай горкай Чыгла, адчулася такая стомленасць у нагах, у плячах, што цяжка было паварушыцца, а каб узабрацца на горку, дык страшна было і падумаць».

Зразумела, за такім апісаннем цяжка разглядзець самую Анну Сцяпанаўну.

Асобныя з'явы ў творы проста механічна звязваюцца з вобразам Анны Сцяпанаўны. Што можна сказаць аб сустрэчы яе з шасцігадовым хлопчыкам, які ганяўся з дубцом за гусямі? Або аб размове з Верай пра ўпартасць «хітрых» валоў, якія спыніліся супраць магазіна? Толькі адно: што-ж, і такія рэчы маглі быць у жыцці гераіні. Але-ж гэтага вельмі мала для мастацкага адлюстравання.

І толькі ў канцы чацвёртага раздзела, дзе паказаны цёплы прыём Верай Анны Сцяпанаўны і вячэра настаўніц, аўтар знаходзіць для кожнага з герояў адметную мову і ўласцівыя ім асаблівасці паводзін, і мы, нарэшце, пачынаем пазнаваць Анну Сцяпанаўну.

Аналагічныя прыклады ёсць і ў іншых раздзелах. Сустракаюцца і проста неахайнасці. Манера размовы Еўдакіі характарызуецца, напрыклад, такой дэталлю: «Калі гаварыла, паджымала ніжнюю губу, а верхнюю выцягвала». А праз два абзацы яе субяседніца Чэркасіха «незадаволена апусціўшы ніжнюю ружовую губу, заўважыла...».

Здараецца і так, што аўтар сам недастаткова ўяўляе дэталь, якую паказвае, і яна губляе верагоднасць.

«У аконнай шыбе Мікіта Мінавіч убачыў спачатку цень сваёй раскудлачанай, падрослай за апошнія тыдні, барады, а потым, калі добра прыгледзеўся, заўважыў на двары дзве постаці».

Святло-ж у хаце запалілі пасля гэтага. Калі на двары было цёмна, дык у хаце было яшчэ цямней, — відавочна, на шкле акна ніяк не магла ўзнікнуць цень падыйшоўшага Мікіты Мінавіча.

Ёсць у творы і такія недахопы, якія ніяк не аднясеш да прыватных пагрэшнасцей. У рамане адлюстроўваецца партызанскі рух на Беларусі. Мы бачым першыя крокі партызанскага атрада, арганізаванага Труцікавым і Сакольным. Спачатку партызанам нехапала ваеннай вывучкі, баявой арганізаванасці, дысцыпліны. Сур'ёзна занепакоены становішчам у атрадзе, Сакольны гаворыць Труцікаву: «Пакуль што ў нас не партызанская група, не вайсковая адзінка, а нешта падобнае на дрэнную арцель. Кожны робіць, што хоча, кожны сам сабе гаспадар... Я не ўяўляю, што было-б, калі-б немцы здагадаліся цяпер паслаць сюды аддзяленне ўзброеных фашыстаў, адно толькі аддзяленне!».

Натуральна было-б чакаць, што далей аўтар пакажа, як пераадольваліся цяжкасці арганізацыйнага перыяду. Але гэтага ў творы няма. Для стварэння ўзорнага воінскага парадку, аказваецца, дастаткова было выдаць Труцікаву і Сакольнаму адпаведныя загады і падаць атраду каманду «смірна». Цудоўнае пературварэнне адбылося ў якія-небудзь два-тры дні. Праз тры старонкі пасля размовы Труцікава і Сакольнага чытач чуе з вуснаў партызана: «У нас цяпер сапраўдная вайсковая дысцыпліна, разумееш? Усё па загаду».

Такія, на мой погляд, недахопы гэтага ўвогуле цікавага твора.

П. ШАБЛІНСКІ.

Калгас «Росквіт» Дрысенскага раёна.

На тэмы дня

Ажывіць работу рэдкалегій

У нашым савецкім друку ўстанавілася добрая традыцыя, калі пры рэдакцыях газет і часопісаў створаны рэдакцыйныя калегіі. Дзейнасць рэдкалегій з'яўляецца апраўдаўшай сябе формай калектыўнага вырашэння важнейшых спраў друкаваных органаў і калектыўнай адказнасці за іх ідэйны і дзелавы ўзровень. На пасяджэннях рэдкалегій абмяркоўваюцца планы рэдакцый, а таксама артыкулы і ўсе выступленні па важнейшых прынцыповых пытаннях.

Члены рэдкалегій сваім непасрэдным удзелам дапамагаюць рэдакцыям арганізоўваць работу з аўтарскім актывам, падказваюць цікавыя тэмы і пытанні. І тое, што на апошняй старонцы кожнага часопіса ўслед за словамі «рэдакцыйная калегія» ідзе пералік прозвішчаў людзей, якія ўваходзяць у склад рэдкалегій, — гэта не простая фармальнасць, не шыльда аўтарытэта часопіса, а перш за ўсё сведчанне, што кожны з членаў рэдкалегіі нясе адказнасць за становішча часопіса або газеты, за матэрыялы, якія там друкуюцца.

Гэта агульнавядомая ісціна. Але яе прыходзіцца паўтараць, таму што ў часопісах, якія з'яўляюцца органамі Саюза савецкіх пісьменнікаў Беларусі, рэдкалегіі не працуюць. У свой час у склад рэдкалегій былі ўведзены пісьменнікі, якім праўленне ССП БССР і ўся пісьменніцкая грамадскасць даручыла важнейшую справу калектыўнага кіравання літаратурна-мастацкімі часопісамі.

Але ў працы часопісаў устанавілася няправільная практыка ўзаемаадносін апарата рэдакцыі і рэдкалегіі. Невядома, па якой прычыне рэдакцыі не прыцягваюць да актыўнага ўдзелу ў сваёй рабоце членаў рэдкалегій. Напрыклад, цяжка вызначыць апошнюю дату, калі збіралася на пасяджэнне рэдкалегія часопіса «Полымя». Тут нават няма такога парадку, каб члены рэдкалегіі абавязкова знаёміліся з творамі, якія друкуюцца. Бывае, што нават і не ўсе супрацоўнікі рэдакцыі прачытаюць гэтыя творы. Асабліва гэта назіраецца па аддзелу прозы, дзе лёс матэрыялу вырашае толькі загадчык аддзела. У восьмым нумары друкуюцца на восем аркушаў літаратурныя запіскі А. Міронава аб дзіцячым доме. У сёмым нумары друкуецца новая п'еса А. Маўзона «Наталля Крыўцова». І гэтыя творы ніхто з членаў рэдкалегіі нерэдакцыйных работнікаў не чытаў. А якую-б вялікую карысць прынеслі і для аўтараў і для рэдакцыі кваліфікаваныя рэцэнзіі або заўвагі членаў рэдкалегіі.

Калі дабірацца да прычын з'яўлення памылковых артыкулаў А. Есакова, У. Карпава, што друкаваліся на старонках часопіса «Полымя», дык і тут прычына заключаецца ў тым, што гэтыя артыкулы рэдкалегія не абмяркоўвала.

Няма абмеркавання матэрыялаў на пасяджэннях рэдкалегіі ў альманаху «Советская Отчизна». Калі-б гэта рабілася, дык на старонкі альманаха не трапіў-бы павярхоўны, беспрынцыповы артыкул А. Варшаўскай аб рамане А. Стаховіча «Шырокія гарызонты». Выступленні ў цэнтральным і рэспубліканскім друку зусім ясна сказалі, што твор з'яўляецца сырым, павярхоўным, шэрым, а ў артыкуле А. Варшаўскай надаецца штучная ўяўнасць глыбіні і вялікай мастацкасці гэтага твора.

Няма калектыўнай думкі членаў рэдкалегіі аб літаратурных матэрыялах і ў часопісе «Беларусь».

Набліжаецца II Усесаюзны і III рэспубліканскі з'езды пісьменнікаў. На старонках часопісаў павінна весціся жывая гутарка аб з'явах нашай літаратуры. Трэба падагуліць накоплены станоўчы вопыт. Неабходна канкрэтна, з усёй прынцыповасцю гаварыць пра недахопы. І тут вельмі важна калектыўная думка рэдкалегіі.

Трэба неадкладна ажывіць дзейнасць рэдкалегій. Рэдкалегіі не павінны толькі лічыцца на паперы. Яны павінны працаваць, несці поўную адказнасць за становішча спраў у часопісах і газетах.

Кніжная аўталаўка

З гаража выехаў аўтамабіль «ГАЗ-51» з высокім крытым кузавам светлакарычневай афарбоўкі. Па баках кузава — яркія плакаты і лозунгі. Гэта — аўталаўка Брэсцкага аблспажыўсаюза. Яе задача — давесці кнігу да кожнага калгасніка, работніка МТС, сельскай школы.

У кузаве перасоўнага магазіна — палітычная і сельскагаспадарчая літаратура, кнігі класікаў, рускіх і беларускіх пісьменнікаў.

У першы рэйс прадавец В. Стасюк выехаў у Высокаўскі, Камянецкі, Шарашоўскі, Пружанскі і іншыя раёны. Ва ўсіх вёсках, размешчаных уздоўж шашы, калгаснікі ветліва сустракалі аўталаўку і куплялі патрэбную літаратуру.

За пяць дзён прададзена кніг на шэсць тысяч рублёў. Безумоўна, кніг можна было прадаць значна больш, калі-б не адзін сур'ёзны недахоп — няўважліва была падабрана літаратура для кніжнага перасоўнага магазіна. Напрыклад, механізатары Рагазнянскай МТС былі здзіўлены тым, што не знайшлі кніг на тэхнічныя тэмы. Прадаўцу прыйшлося прыняць ад іх заяўку. Аўталаўка бедная і дзіцячай літаратурай, на якую ў насельніцтва вялікі попыт, недастаткова таксама падручнікаў.

Добра было-б наладзіць адначасова і прапаганду кнігі, расказваць пакупнікам аб творчасці пісьменнікаў, працах вучоных па сельскай гаспадарцы, аб тым, якія новыя кнігі будуць сёлета выдадзены і якіх можна чакаць у будучым.

С. ГУСЕЎ.

1904 А. П. ЧЭХАЎ 1954

Неўміручы мастак

Антон Паўлавіч Чэхаў належыць да ліку тых нямногіх пісьменнікаў, творы якіх можна... не толькі можна, а хочацца перачытваць бясконца. Кнігі яго не стамляюць, не здаюцца ўжо вядомымі, ужо няновымі, як не стамляе нас чытанне вечна глыбокай і вечна новай, хвалюючай кнігі, назва якой — жыццё.

«Чэхаў — непараўнаны мастак, — гаварыў Леў Талстой. — Так, так іменна: непараўнаны мастак жыцця. І вартасць яго творчасці ў тым, што яна зразумелая і родная не толькі ўсякаму рускаму, але і ўсякаму чалавеку наогул».

Тое, што сёлетні чэхаўскі юбілей адзначаюць не толькі народы нашай краіны, што імя Чэхава прыгожа гучыць у падтэксце найпрыгажэйшага слова — мір, што абаяльны вобраз аднаго з найбольш чалавечных пісьменнікаў свету натхняе нас і нашых сяброў за мяжой на барацьбу за лепшую будучыню чалавецтва, — гэты знамянальны і радасны факт яшчэ раз красамоўна гаворыць аб велічы Чэхава, яшчэ раз кліча цябе да яго несмяротных старонак.

Нашаму брату, хто хоча быць сапраўдным, вартым свайго часу літаратарам, трэба і неабходна чытаць і перачытваць Чэхава, нястомна і рупліва вывучаць яго непаўторны мастацкі почырк, знаходзіць і раскрываць сакрэт яго сілы.

З'езды пісьменнікаў, рэспубліканскі і ўсесаюзны, да якіх мы рыхтуемся, будуць, безумоўна, не толькі справаздачай аб дасягненнях і недахопах літаратуры, але і сур'ёзнай размовай аб нашых высакародных задачах, аб нашай вялікай запазычанасці перад народам і партыяй.

Адной з галоўных задач, якая патрабуе ад нас неадкладнага і грунтоўнага вырашэння, з'яўляецца задача далейшага ўздыму беларускай совецкай прозы.

Паспяховае вырашэнне гэтага пытання ў немалой меры залежыць ад правільнага і глыбокага вывучэння літаратурнай спадчыны. Наяўнасць вялікай рускай літаратуры, наша брацкая дружба з рускім народам даюць нам сапраўды неабмежаваныя магчымасці творчай вучобы. Рускі класічны раман, аповесць і апавяданне, у станаўленні якіх прымалі ўдзел такія гіганты сусветнай літаратуры, як Пушкін, Лермантаў, Гогаль, Талстой, Чэхаў і Горкі, з'яўляюцца цудоўным крытэрыем нашых дасягненняў і недахопаў, бездакорна правільнай меркай мастацкай дасканаласці.

Імя Антона Паўлавіча Чэхава ў першую чаргу звязана з уздымам на небывалую вышыню жанра апавядання. Узорна сціплы ў ацэнцы сваёй уласнай творчасці, Чэхаў з законнай гордасцю гаварыў, звяртаючыся да маладых пісьменнікаў: «У адным сэнсе вы ўсе павінны быць мне ўдзячнымі. Гэта я адкрыў шлях для аўтараў маленькіх апавяданняў». Гэты шлях быў адкрыты і асаблівасцю чэхаўскага генія, і нястомнай працай пісьменніка, дэвізам якога было выслоўе: «кароткасць — сястра таленту».

Не закрываючы вачэй на дасягненні, якія ёсць у нас у гэтым жанры, мы павінны прызнацца, што справа з апавяданнем патрабуе шмат большай увагі, аб чым даўно і слушна гаворыць наш чытач. Менш, чым трэба, гаворыць аб гэтым крытыка, якая, разам з большасцю празаікаў, перажывае сёння «эпічнае» захапленне, забываючыся часамі, што побач з раманам і аповесцю апавяданне павінна займаць сваё пачэснае месца.

Не страшна, бадай, яшчэ раз паўтарыць вядомую ісціну аб тым, што ні шырыня, ні, тым больш, глыбіня паказу жыцця не вызначаюцца колькасцю аўтарскіх аркушаў. Такія шэдэўры, як «Унтэр Прышыбееў», «Хамелеон», і мноства іншых апавяданняў, памер якіх літаральна можна акрэсліць колькасцю слоў, і такія апавяданні, як «Іоныч», «Дама з сабачкам», «Дом з мезанінам», і іншыя апавяданні, якія, па трапнаму азначэнню В. Ермілава, убіраюць у сябе аповесць і раман, з'яўляюцца цудоўнымі прыкладамі насычанасці радка, прыкладамі класічнай канцэнтрацыі тыповага ў паказе жыцця.

«... Узняўшыся вышэй, авалодаўшы сваімі ўражаннямі, — пісаў Горкі ў рэцэнзіі на аповесць «У яры», — ён, як вялізны рэфлектар, сабраў у сябе ўсе праменні жыцця, усе фарбы, узважыў усё дрэннае і добрае ў сэрцы сваім». І, разам з тым: «Страшная сіла яго таленту іменна ў тым, што ён **ніколі нічога не выдумвае ад сябе,** не малюе таго, «чаго няма на свеце». Гэтыя словы вялікага зачынальніка сацыялістычнага рэалізма, нястомнага змагара за праўдзівасць у паказе жыцця выдатна пераклікаюцца са словамі самога Чэхава: «Не выдумвай пакут, якіх не зведаў, і не малюй карцін, якіх не бачыў, — бо хлусня ў апавяданні значна больш нудная, чым у гутарцы».



А. П. Чэхаў.

Малюнак мастака **В. Клімашына.**

Бачыць жыццё, тыповае ў жыцці і гаварыць аб гэтым праўдзіва, коратка і моцна — вось чаму мы павінны вучыцца ў Чэхава.

У Чэхава мы павінны вучыцца павазе да слова, да мовы, таго матэрыялу, з якога будуем творы. «Калі ў аўтара няма «стылю», — гаварыў Антон Паўлавіч,— ён ніколі не будзе пісьменнікам. Калі-ж ёсць стыль, свая мова, ён, як пісьменнік, не безнадзейны. Тады можна разважаць аб другіх баках яго твораў». Аб гэтым трэба памятаць і нам, празаікам, і тым, хто крытыкуе нашы творы, часцей за ўсё адводзячы пытанню мовы адно з апошніх месц. Справа, вядома, не ў штучных помешках свайго стылю, не ў патугах на арыгінальнасць і прыгажосць, а ў прастаце паказу, майстэрству лепкі вобраза. «Ён кідае нібы бязладна словамі, — гаварыў Леў Талстой, — і, як мастак імпрэсіяніст, дасягае сваімі мазкамі здзіўляючых вынікаў». Значэнне мазка, мастацкай дэталі ўзнята Чэхавым на небывалую, здзіўляючую вышыню.

Возьмем для прыкладу вобраз Елізарава Кастыля з аповесці «У яры».

Вобраз гэты зроблены некалькімі мазкамі, параскіданымі па палатне аповесці, на першы погляд, і сапраўды «бязладна». У трэцім раздзеле, на вяселлі, Кастыль выступае ўпершыню. «Высокі, хударлявы стары з такімі густымі брывамі, што вочы былі ледзь бачныя». Валацуга цясляр, які па звычцы ўсё рамантаваць «аб кожным чалавеку або рачы меркаваў толькі з боку трываласці». Ён то тонка ўсхліпвае ад радасці, то рагоча голасна, басам. У пятым раздзеле да вобраза дадаецца яшчэ адна рыса. «Хто працуе, хто церпіць, той і старшы», — наіўна выказвае ён сваю веру ў значэнне чалавека працы. У дзевятым, апошнім раздзеле аповесці, Кастыль яшчэ раз выказвае сваё жыццёвае крэда больш выразна: «Уласны дом або чужы, усё роўна, абы цёпла было ды бабы не лаяліся... Калі я ў маладых гадах быў, я вельмі сваю Настассю пікадаваў. Бабка была ціхая. І бывала ўсё: «Купі, Макарыч, дом! Купі, Макарыч, дом! Купі, Макарыч, каня». Памірала, а ўсё гаварыла: «Купі, Макарыч, сабе дрожкі-бегунцы, каб пешкі не хадзіць». А я толькі пернікі ёй купляў, больш нічога». Перад гэтым, у шостым раздзеле, у цудоўнай карціне мацярынскага шчасця беднай, абаяльнай Ліпы, аўтар нібы зусім выпадкова, між іншым, зрабіў яшчэ адзін мазок да вобраза Кастыля. Хлопчык, дзіцёнак Ліпы, калі маладая маці, прыгожая ў сваёй радасці, кланялася яму і віталася з ім, як з дарослым, і кідалася да яго кулём, і цалавала, малы чалавечак, «якога нават завуць Нікіфарам», задзіраў у калысцы свае чырвоныя ножкі, «і плач яго мяшаўся са смехам, як у цесляра Елізарава». Адна маленькая дэталь, адзін апошні мазок — і вобраз поўнасцю закончаны. Толькі цяпер мы можам, услед за Горкім, сказаць, што Кастыль — «чалавек мудры і мілы, як малое дзіця».

Такіх — і значна лепшых — дэталей у апавяданнях Чэхава безліч. Заключным мазком да вобраза Белікава, напрыклад, быў яго апошні футляр — труна; хамелеон-Ачумелаў не атрымаўся-б без шыняля, які яму то надзявае, то здымае з яго Ялдырын; Каштанка не была-б поўнацэнным сабакам без курынай лапкі, якую яна схавала ад гаспадара за шафай...

Майстэрства паказу праз трапна знойдзеную дэталь характэрна для Чэхава і ў пейзажы. «У апісанні прыроды, — гаварыў ён, — трэба хапацца за дробныя прыватнасці, групуючы іх такім чынам, каб пасля прачытання, калі заплюшчыш вочы, уяўлялася карціна». Як і ў абмалёўцы характару, так і ў пейзажы дэталі ўжываюцца з гранічнай дакладнасцю і скупасцю, — нічога лішняга, толькі тое, што без промаху б'е па цэлі. Можна ўспомніць славутае шкельца ад разбітай бутэлькі, якое блішчыць на грэблі ў месячную ноч, чысты снег у апавяданні «Прыпадак», надрэчную вярбу ў «Скрыпцы Ротшыльда» і многа іншага.

Чэхаў даў нам выдатныя ўзоры стройнасці і глыбіні сюжэта, бездакорнай кампазіцыі. У апавяданнях яго надзвычай моцна выяўлены драматургічны элемент, — усе яны ў дзеянні, з біеннем гарачага сэрца, з бездакорнаю працай мускулаў. Нідзе нічога лішняга, усюды мудрая скупасць гаспадара і бліскучая грацыя рухаў.

У апраўданне сваёй ленасці можна «пафіласофску» ўздыхнуць і сказаць: «Дык гэта-ж, браток, Чэхаў!» І гэта будзе няпраўдай, не ўсёй праўдай, якую мы ведаем пра яго. Чэхаў не толькі вялікі талент з яго непаўторным гумарам, з яго глыбока чалавечнай тугой, якая «нібы ўбірае ў сябе і гнеў, і пагарду, і пратэст, і смех», — Чэхаў яшчэ і вялікі працаўнік. Без гэтай упартай, натхнёнай працы над развіццём таленту мы не ведалі-б Чэхава такім, якім ён ёсць. «Я не бачыў чалавека, — пісаў Горкі, — які адчуваў-бы значэнне працы, як асновы культуры, так глыбока і ўсебакова, як Антон Паўлавіч». «Нездавальненне сабой, — гаварыў ён сам, — складае адну з карэнных уласцівасцей усякага сапраўднага таленту». І ён быў вечна нездаволены сабой, вечна шукаў, вечна вучыўся. «Каб стаць сапраўдным пісьменнікам, — вучыў Чэхаў, — трэба аддаць сябе выключна гэтай справе. Дылетанцтва тут, як і ўсюды, не дазволіць зайсці далёка. У гэтым мастацтве, як і ва ўсякім, патрэбен талент, але і праца. Трэба працаваць самым сапраўдным чынам».

Чытаць і перачытваць Чэхава мы, літаратары, павінны не толькі як яго ўдзячныя чытачы, але і як старанныя, дапытлівыя вучні. У яго мы павінны вучыцца не толькі майстэрству, але і любві да працы.

Жыццё і творчасць Чэхава — натхняючы прыклад служэння народу.

Янка БРЫЛЬ.

Жывое слова

Неўміручае слова А. П. Чэхава служыла і служыць магутнай зброяй у барацьбе за светлую будучыню чалавецтва — комунізм.

Правадыры Комуністычнай партыі і Совецкай дзяржавы праяўлялі цікавасць да творчасці вялікага рускага пісьменніка, высока цанілі сапраўдную народнасць. рэалізм яго твораў, шырока карысталіся яго вобразамі ў барацьбе.

Паводле ўспамінаў А. І. Ульянавай-Елізаравай, моцнае ўражанне зрабіла на 22-гадовага Владзіміра Ільіча апавяданне «Палата № 6». Намаляваныя ў апавяданні гвалт, грубасць, невуцтва і дзікае свавольства, таптанне чалавечых правоў і знявага чалавечай годнасці ў палаце № 6 уяўляліся Леніну сімвалам усёй грамадскай сістэмы Расіі канца XIX стагоддзя. В. І. Ленін карыстаўся гумарам А. П. Чэхава ў мэтах развянчання палітычных ворагаў партыі. Здрадніцкую тактыку меншавікоў — іх двурушніцтва, непаслядоўнасць і прыспасабленства В. І. Ленін класічна закляйміў вобразам гераіні чэхаўскага апавядання «Душачка».

«Тав. Старавер вельмі падобны на гераіню чэхаўскага апавядання «Душачка», — пісаў В. І. Ленін аб адным з меншавікоў — Стараверы (Патрэсаве А. Н.) у 1905 годзе ў артыкуле «Соцыял-дэмакратычная душачка». — Душачка жыла спачатку з антрэпрэнёрам і гаварыла: мы з Ванічкам ставім сур'ёзныя п'есы. Потым жыла яна з гандляром лесам і гаварыла: мы з Васічкам абураны высокім тарыфам на лес. Нарэшце, жыла з ветэрынарам і гаварыла: мы з Колічкам лечым коней. Так і тав. Старавер. «Мы з Леніным» лаялі Мартынава. «Мы з Мартынавым» лаем Леніна. Мілая соцыял-дэмакратычная душачка! у чыіх-жа абдымках апынешся ты заўтра?»

Побач з сатырычнымі вобразамі Н. В. Гогаля і Салтыкова-Шчэдрына В. І. Ленін і І. В. Сталін у розны час карысталіся вобразам «Чалавека ў футляры» Белікава. Палітычнымі «чалавекамі ў футляры» называў В. І. Ленін кадэтаў, палахліва насоўваючых сабе на вочы «філістэрскі калпак» перад тварам буры — народнай рэволюцыі. У новым палітычным аспекце вобраз Белікава быў прыменены І. В. Сталіным на XVI з'ездзе ВКП(б) да былых лідэраў правай апазіцыі.

Белікаў, развіваў сваё параўнанне І. В. Сталін, баяўся, як чумы, усяго новага, усяго таго, што выходзіць са звычайнага круга шэрага абыватальскага жыцця. Адкрылі новую сталовую, — у Белікава ўжо трывога: «яно, вядома, мабыць, і добра мець сталовую, але глядзіце, як-бы чаго не выйшла». Арганізавалі драматычны гурток, адкрылі чытальню, — Белікаў зноў у трывозе: «драматычны гурток, новая чытальня, — для чаго-б гэта? Глядзіце, як-бы чаго не выйшла». У гэтай інтэрпрэтацыі вобраза Белікава раскрываецца як гістарычная тыповасць яго, так і эстэтычная значымасць вобраза для нашай сучаснасці.

Гумарыстычныя і сатырычныя вобразы твораў А. П. Чэхава — душачкі, Белікава, унтэра Прышыбеева і інш.—атрымалі ў палітычным тлумачэнні правадыроў нашай партыі і народа новы гістарычны сэнс і значэнне вострай зброі ў барацьбе совецкага народа з перажыткамі капіталізма ў свядомасці, з усім тым, што прагніло, аджыло, што тармозіць наш рух наперад.

Выдатны дзеяч Комуністычнай партыі і Совецкай дзяржавы М. І. Калінін неаднаразова звяртаўся да совецкай мастацкай інтэлігенцыі, работнікаў літаратуры і мастацтва з заклікам і патрабаваннем — вучыцца ў А. П. Чэхава, «неперайм альнага майстра рускага слова».

М. І. Калінін гаварыў аб вялікай мастацкай сіле твораў А. П. Чэхава, вялікага пісьменніка-рэаліста, ставячы яго ў цесную сувязь з соцыялістычнай культурай, як аднаго з вялікіх яе літаратурных папярэднікаў.

Выкарыстанне дзеячамі Комуністычнай партыі чэхаўскіх вобразаў у палітычнай барацьбе — выдатнае сведчанне сілы літаратурных тыпаў, створаных вялікім рускім пісьменнікам, прагрэсіўнага значэння яго творчасці.

Узор майстэрства

«Адзіны з мастакоў нашага часу, які ў высокай ступені засвоіў майстэрства пісаць так, «каб словам было цесна, а думкам — прасторна», — так трапна і праўдзіва ахарактарызаваў Антона Паўлавіча Чэхава А. М. Горкі. Сапраўды, творы А. П. Чэхава можна чытаць і перачытваць бясконца, і кожны раз вы знойдзеце ў іх нешта новае, такое, чаго вы не заўважылі раней, — так бязмежна багатыя яны думкамі, вобразамі.

Кожны сказ, кожнае слова ў іх заключае глыбокі сэнс, а з майстэрскіх спалучэнняў гэтых слоў і сказаў паўстае перад намі ў самых тонкіх адценнях свет людскіх настрояў, пачуццяў, дум і летуценняў, паўстае цудоўная руская прырода ў самых багатых і рознастайных яе фарбах, гуках. Мы ўваходзім у гэты свет, жывем у ім, гаруем і радуемся, любім, ненавідзім, марым — такая сіла ўздзеяння на нас Чэхава як мастака.

А. П. Чэхаў жыў у змрочны час. Страшная праўда тагачаснага жыцця адлюстравана ў яго творах, адлюстравана без усякіх прыкрас, такой, якой бачыў яе пісьменнік. Але якім-бы ні здаваўся, на першы погляд, аб'ектыўным паказ гэтага жыцця, мы ў кожным творы адчуваем аўтара — чалавека крыштальна чыстай душы і вялікага сэрца. Мы адчуваем яго ў мяккай, летуценнай журбе, якой прасякнуты многія творы, у пошуках выйсця з жахлівай рэчаіснасці, у надзеях і спадзяваннях.

Творы А. П. Чэхава неаднаразова выдаваліся ў перакладах на беларускую мову. Цяпер у Дзяржаўным выдавецтве БССР выходзіць вялікі аднатомнік яго апавяданняў. Мне ў ліку другіх беларускіх пісьменнікаў выпаў гонар перакласці некалькі рэчаў для аднатомніка.

Трэба сказаць, што перакладаць Чэхава цяжка. Цяжка перадаць усё багацце, усю музычнасць вялікай рускай мовы, якой так дасканала валодаў пісьменнік. Нездарма вялікі Горкі пісаў: «...будучы гісторык літаратуры, гаворачы аб росце рускай мовы, скажа, што мову гэтую стварылі Пушкін, Тургенеў і Чэхаў». Аднак работа над перакладамі Чэхава прыносіць сапраўдную творчую асалоду, бо ў гэтай рабоце яшчэ глыбей пазнаеш пісьменніка, выдатнага майстра мастацкага слова.

Я не ўяўляю пісьменніка свайго пакалення, які ў большай ці ў меншай меры не вучыўся-б і не вучыцца ў Чэхава яго мастацкім прыёмам, яго адносінам да мовы, яго ўменню будаваць твор, як закончанае мастацкае цэлае. Чытаючы творы пачынаючых празаікаў, таксама заўважаеш вельмі часта ўплыў Чэхава.

Але як у пачынаючых, так і ў некаторых пісьменнікаў, якія ўжо друкуюцца, часам можна заўважыць аднабаковы падыход да вучобы ў Чэхава. Чэхава ўспрымаюць як майстра мастацкай дэталі, забываючы аб тым, што механічна складзеныя дэталі, якімі-б яны ні былі трапнымі, не дадуць мастацкага твора, калі ў аўтара абмежаваны кругагляд, калі ў яго няма чаго сказаць новага, калі ён не валодае ўсім комплексам сродкаў, патрэбных для пабудовы мастацкага твора.

Тонка, па-майстэрску зробленыя, скажам, асобныя дэталі машыны нічога яшчэ нам не гавораць, калі мы не бачым усёй машыны і яе работы.

У А. П. Чэхава — геніяльнага майстра слова — ёсць чаму вучыцца, але вучоба ў яго павінна быць не механічная, а творчая, вучоба іменна таму майстэрству, якое дазволіла яму ствараць свае выдатныя творы.

Вялікі сын вялікага рускага народа А. П. Чэхаў блізкі ў той-жа час усім народам нашай Радзімы. Блізкі ён і беларускаму народу, які чытае яго творы і на рускай і на роднай беларускай мове і глыбока шануе памяць аб вялікім пісьменніку.

Тарас ХАДКЕВІЧ.

Хвалюючая сустрэча

Здаецца, няма ніводнага прафесійнага тэатра ў нашай краіне, які не іграў-бы якую-небудзь з п'ес А. П. Чэхава. І ўсё-ж, уключэнне ў рэпертуар нашага тэатра п'есы «Чайка» глыбока ўсхвалявала ўвесь творчы калектыў. Гэта-ж Чэхаў! І не што-небудзь іншае, а «Чайка»! Якая яшчэ з п'ес А. П. Чэхава можа пахваліцца такой яркай сцэнічнай гісторыяй? А раптам у нас будзе правал! Бо аб гэтай п'есе Неміровіч-Данчэнка сказаў: «Ставіць «Чайку», значыць рызыкаваць жыццём». Ці варта нам рызыкаваць?..

Гэтыя і многія іншыя думкі хвалявалі ў тыя дні творчы калектыў.

Поўны жадання ўдасканальваць сваё майстэрства, з гарачым імкненнем па меры сваіх магчымасцей данесці да гледача паэтычную прывабнасць натхнёнага твора Чэхава тэатр працаваў над «Чайкай».

... У абстаноўцы 80-х гадоў, калі рэакцыя душыла ўсе прагрэсіўныя сілы ў краіне, калі народніцтва пацярпела крушэнне, — галоўная маса рускай інтэлігенцыі аказалася на раздарожжы, ідэйна бяззбройнай. Лепшая частка дэмакратычнай інтэлігенцыі пакутліва перажывала сваё ідэйнае бездарожжа, адчувала вострую патрэбу ў ідэі, здольнай аб'еднаць на барацьбу за грамадскую перабудову. І разам з тым, усё больш інтэлігентаў нагружалася ў абыватальскае балота, траціла веру ў светлую будучыню. А. П. Чэхаў бачыў, як ва ўмовах соцыяльнай няроўнасці, грубага дэспатызму, з аднаго боку, і поўнага бяспраўя — з другога, у атмасферы прыніжанасці і мяшчанскай тупасці гінуць лепшыя пачуцці людзей. Ён з болем у сэрцы гаварыў: «Так далей жыць немагчыма!» Адначасова з гэтым 90-я гады знамянуюць сабой і нарастанне рэволюцыйнага руху ў краіне. Назіральны і чулы мастак адчуваў гэта, верыў у цудоўную будучыню Радзімы.

Калектыў тэатра імя ЛКСМБ імкнуўся прачытаць «Чайку», як палымяны заклік да подзвіга ў імя светлай будучыні горача любімай Радзімы.

П'еса «Чайка» непасрэдна прысвечана тэме мастацтва. Чэхаў, расказаўшы ў п'есе аб цяжкім шляху мастака, аб сутнасці таленту, аб тым, што такое чалавечае шчасце, — узняў над усімі слабымі, што страцілі веру ў будучыню, светлы вобраз чайкі, з яе цудоўным вольным палётам.

Не падзенне падстрэленай чайкі, а палёт цудоўнай, пяшчотнай, вольнай птушкі высока да сонца — такая паэтычная тэма п'есы.

Ніна Зарэчная — гэта мастацтва, якое перамагае цемру, заўсёды імкнецца наперад і вышэй.

Антон Паўлавіч пісаў пра «Чайку», калі працаваў над ёй, што «ў п'есе... пяць пудоў кахання». Сапраўды, у п'есе многа кахання. Але галоўнае не ў гэтым. Галоўны канфлікт п'есы «Чайка» тэатр бачыць у сутыкненні мары аб цудоўным, аб шчасці з рэальным жыццём. Гэты канфлікт ахоплівае ўсіх без выключэння дзеючых асоб п'есы. Але найбольш ярка ён адбіваецца на лёсе двух персанажаў, супрацьпастаўленых адзін другому: Ніны Зарэчнай і Канстанціна Трэплева. Ніна Зарэчная цаной цяжкіх ахвяр заваявала веру ў сваё прызванне. Трэплеў — не верыць і не ведае, у чым яго прызванне. Зарэчная пры сутыкненні сваёй мары з жыццём набыла гордае шчасце; яна ведае: свет цудоўны, калі ў ім перамагае воля да святла. Талент-жа Трэплева так і загінуў, не бачачы мэты, здольнай яго натхніць. А празмернае захапленне асабістым пачуццём да Ніны прыводзіць яго да расчаравання ў жыцці, да самагубства.

П'есай «Чайка» А. П. Чэхаў адкрыў новыя шляхі ў развіцці рускай рэалістычнай драматургіі.

Высокага ўзроўню акторскага майстэрства, вялікай шчырасці выканання патрабуе ад любога творчага калектыва ўвасабленне на сцэне гэтых простых і разам з тым надзвычай складаных чэхаўскіх вобразаў, якія, паводле яго ўласнага выказвання, з'яўляюцца «вынікам назірання і вывучэння жыцця». Ён гаворыць: «Я не схлусіў ні на адзін сантыметр і не перамудрыў ні на адну ёту». Патрэбна вялікае пачуццё ансамбля, значная пастановачная культура, каб стварыць на сцэне чэхаўскую атмасферу ў спектаклі — атмасферу шчырай праўды жыцця.

Калектыў нашага тэатра ведае, што ён дамогся яшчэ не вельмі многага ва ўвасабленні ідэй і думак Чэхава на сцэне. Але, разам з тым, усе мы лічым нашу работу над «Чайкай» важнейшай падзеяй у жыцці тэатра, якая прынесла калектыву велізарную творчую радасць. Сустрэча з творам Чэхава адыграла вялікую ролю ў справе павышэння прафесійнага майстэрства і культуры тэатра ў цэлым.

І. ПАПОЎ,

галоўны рэжысёр тэатра імя ЛКСМБ.



Тэатр імя Ленінскага комсамола Беларусі ўпершыню ў рэспубліцы ажыццявіў пастаноўку п'есы А. П. Чэхава «Чайка».

П'еса была паказана мінскім гледачам ў чэхаўскія дні. Рэжысёр спектакля І. Папоў, мастак М. Смародкін. У галоўных ролях выступілі А. Качаткова, Т. Канавалава, П. Маркін, Б. Уксусаў, Г. Волкаў і іншыя.

На здымку: сцэна са спектакля «Чайка». У ролі Трэплева — артыст **Б. Уксусаў,** у ролі Ніны Зарэчнай — артыстка **Т. Канавалава.**

Фото **І. Салавейчыка.**

Спектакль вялікага выхаваўчага значэння

(«Гімназісты» ў Маскоўскім тэатры юнага гледача)

Аб сваёй п'есе для юнацтва выдатны совецкі драматург К. Трэнёў пісаў у 1936 годзе: «У маёй новай п'есе «Гімназісты» паказваецца жыццё старой дарэволюцыйнай школы ў губернскім горадзе. У п'есе ўзяты востры момант — напярэдадні рэволюцыі 1905 года.

Пачынаецца «палітычная вясна» 1905 — аграрныя беспарадкі, забастоўкі. У старой школе ствараюцца падпольныя гурткі гімназістаў. Начальства гімназіі ў трывозе. Яно стараецца зрабіць выгляд, што ў школе ўсё ў парадку, але на самой справе вядзе жорсткую барацьбу з падпольнымі гурткамі.

Дачка беднага чыноўніка Ольга Чарнічкіна выключана з гімназіі за ўдзел у падпольным гуртку. Начальства гімназіі, не жадаючы ўказваць на палітычную прычыну гэтай справы, матывіруе выключэнне дзяўчыны яе разбэшчанасцю. Гэта прыводзіць да трагедыі дзяўчыны, якая спрабуе пакончыць жыццё самагубствам. Ольга Чарнічкіна, падтрыманая гімназістам Паўлам — сынам шаўца, заснавальнікам падпольнага гуртка ў гімназіі, і настаўнікам Брагіным, пераадольвае ў сабе гэты крызіс і ўцягваецца ў рэволюцыйны рух».

Такая ідэйная задума і сюжэт п'есы «Гімназісты», высокія мастацкія якасці якой вытрымалі выпрабаванне часу — найбольш дасканалы крытэрый каштоўнасці твораў мастацтва.

З асаблівым хваляваннем глядзіш гэту п'есу ў тым тэатры, для якога яна напісана і дзе ўпершыню была пастаўлена ў 1936 г. У пастаноўцы — новыя выканаўцы ролей і новы рэжысёр. А п'еса паранейшаму ідзе, пацвярджаючы сваё права на вялікае сцэнічнае жыццё.

Пафас і каштоўнасць спектакля — у майстэрстве, у мастацкай культуры рэжысёра заслужанага артыста РСФСР П. Цэтнеровіча, мастака В. Талалая і ўсяго калектыва тэатра.

Спектакль таленавітага калектыва Маскоўскага тэатра юнага гледача напоўнены жывым дыханнем вялікай рэволюцыі, накіраваны ў наша сёння, у будучыню.

У спектаклі ўдала пастаўлены масавыя сцэны, як, напрыклад, першая карціна — у гарадскім садзе, дзе гімназісты збіраюцца на падпольны сход. У гэтай сцэне знойдзена атмасфера неспакою, набліжэння бурных рэволюцыйных падзей.

Ярка і выразна, з пачуццём тонкага гумару іграюцца сцэны ў гімназіі, асабліва ў класе — на ўроках «Ванькі-каіна» і настаўніка гісторыі Сарданапаленкі.

Жывое, унутрана і знешне яркае аблічча стварае ў «Ваньку-каіне» артыст М. Калеснікаў. Яго герой — інспектар Адамаў усёй сваёй агіднай істотай ненавідзіць гімназістаў, якіх ён закліканы вучыць і выхоўваць. Ён злосны, каварны і хітры ў сваім служэнні старому самадзяржаўнаму свету. Дастаткова ўспомніць дзве кароткія сцэны Адамава — у доме Чарнічкіна і ў канцы спектакля, каб пераканацца ў вялікай сцэнічнай выразнасці гэтага вобраза.

Тыповымі прадстаўнікамі руцінёраў старой гімназіі выступаюць настаўнік гісторыі — невук і ліслівец Сарданапаленка (артыст П. Гаўрылаў), дырэктар мужчынскай гімназіі Лягушаў, завонкавай дабрачыннасцю якога выглядае чалавек, запалоханы высокім начальствам (артыст В. Якаўлеў), нікчэмны і бездапаможны наглядчык Храшчоў (артыст В. Магула). Асабліва вылучаецца ў гэтай групе абаронцаў старых асноў школы наглядчыца Карасёва—па трапнаму празванню вучняў «Шчука» — у востра сатырычным выкананні В. Стручковай. Звычкі страшэннага драпежніка ў абыходжанні з гімназісткамі найбольш трапна характарызуюць «Шчуку».

Запамінальныя, індывідуалізаваныя вобразы гімназістаў ствараюць у масавых сцэнах артысты Е. Васільеў (вечны зубрыла Буцэнка) і Р. Быкаў (падхалім, выскачка і даносчык Пыжоў). Для выканаўцаў гэтых ролей характарна мяккасць, прастата і пачуццё меры, якія ўласцівы большасці акцёраў тэатра. Гэта трэба сказаць і аб выкананні складанай ролі Віктара Югава В. Раждзественскім. Акцёр выкрывае свайго «героя», стаўшага здраднікам сяброў, з якімі ён толькі «іграў» у падпольшчыкаў. Да сапраўдных падпольшчыкаў прыстасавалася выкрытая імі і лёгкадумная Дуся (артыстка І. Папе)

Асабліва моцнае ўражанне пакідаюць сцэны паміж бацькам і дачкой у доме Чарнічкіна, а таксама іх дыялаг і сцэна з начальніцай жаночай гімназіі Празароўскай (артыстка Н. Арцем'ева), з інспектарам мужчынскай гімназіі Адамавым і настаўнікам Брагіным.

Актрыса Р. Вінаградава хвалюе гледача глыбінёй перажываванняў яе гераіні—Ольгі, даведзенай да адчаю і да самагубства. Шкада, што ў другіх сцэнах спектакля Ольга Вінаградавай менш жыццёвая і недастаткова пераканальная. Зніжае якасць выканання гэтай ролі і слабасць голасу артысткі. Няма ў ім той вялікай сілы, мужнасці і гневу, характэрных для Ольгі, якая стала на шлях барацьбы за свае погляды.

Са станоўчых вобразаў, якія нясуць асноўную ідэйную нагрузку твора, найбольш удаліся смелы, спрытны і вынаходлівы Жорж Казлоў (артыст Н. Багатыроў); простая, сумленная працаўніца і пяшчотна любячая маці прачка Вароніна (артыстка М. Зорына), яе сын Павел, адданы рэволюцыйнай справе, непрымірымы з яе ворагамі (артыст В. Шугаеў). Некалькі схематычны, намаляваны толькі адной фарбай вобраз рабочага Арцюхова (артыст С. Грэбеннікаў). Выканаўца не скарыстоўвае поўнасцю той добры матэрыял, які дадзены ў п'есе.

Маскоўскі тэатр юнага гледача зрабіў вялікую і карысную справу, вярнуўшы да жыцця адзін з лепшых спектакляў свайго рэпертуара, і тым самым зноў даказаў сапраўдную сцэнічнасць п'есы «Гімназісты». Беларускі глядач удзячны калектыву за культурны спектакль, які з цікавасцю глядзіць як дарослы, так і юны глядач.

А. БЕСТУЖАЎ.

Сцэна са спектакля «Гімназісты». Ольга — арт. **Р. Вінаградава**, Павел — арт. **В. Шугаеў**.
Фото **І. Салавейчыка.**

Канцэрты балгарскіх артыстаў

За апошні час сталіцу Беларусі ўсё часцей наведваюць выдатныя мастацкія калектывы і асобныя выканаўцы з краін народнай дэмакратыі. Услед за прыездам у Мінск Кітайскага музычнага тэатра, польскага ансамбля «Мазоўшэ» і чэшскага нанета гэтымі днямі адбыліся цікавыя канцэрты вядомых балгарскіх спевакоў, салістаў Сафійскай оперы, лаўрэатаў Дзімітраўскай прэміі Ніколы Ніколава і Ліліі Васілёвай. Салісты паказалі добрую вакальную школу, выдатную культуру выканання і майстэрскае валоданне ўсімі адценнямі сваіх галасоў.

Нікола Ніколаў валодае голасам вельмі прыгожага тэмбру (драматычны тэнар), аднолькава прыемным як у гераічных, так і ў лірычных месцах. Выкананне артыста вылучаецца тонкай фразіроўкай у спалучэнні з вялікім тэмпераментам і добрым густам. Прафесійнае валоданне голасам дазваляе артысту ствараць рознастайныя па характару вобразы і даносіць да слухачоў усё багацце фарбаў мастацкага вобраза. У канцэртах у Мінску Н. Ніколаў з поспехам выканаў такія розныя па характару творы сусветнай опернай класікі, як арыя Каварадосі з апошняга акта оперы «Тоска» Пучыні і драматычна напружаная арыя Каніё з оперы «Паяцы» Леанкавала. Трэба падкрэсліць, што артыст да канца, да апошніх тактаў музыкі застаецца ў вобразе, тым самым паказваючы высокую культуру і добры густ. Гэта асабліва прыкметна было пры выкананні арыі Каніё.

Спяванне Ліліі Васілёвай таксама вылучаецца сапраўдным артыстызмам, дасканалай вакальнай тэхнікай і свабодай у валоданні голасам. Добрая вакальная школа дапамагае артыстцы паказаць тэмбравую рознастайнасць голасу: яна лёгка і натуральна выконвае розныя сапранавыя партыі — ад каларатурных да лірыка-каларатурных і нават чыста лірычных. Голас яе — роўны ва ўсіх рэгістрах. Таму ў канцэртах аднолькава ярка прагучэлі ў выкананні Л. Васілёвай арыя Мажэнкі з оперы «Прададзеная нявеста» Сметаны і арыя Віялеты з оперы «Травіята» Вердзі.

У заключэнне канцэртаў Л. Васілёва і Н. Ніколаў з вялікім уздымам выканалі складаны і псіхалагічна тонкі дуэт-сцэну Мімі і Рудольфа з оперы «Багема» Пучыні.

Шматлікая аўдыторыя, якая запоўніла вялікую тэатральную залу, цёпла вітала балгарскіх артыстаў і ўважліва праслухала ўсю праграму. Усе оперныя ўрыўкі ішлі ў суправаджэнні сімфанічнага аркестра Белдзяржфілармоніі (дырыжор Б. Афанасьеў), які акампаніраваў чула і досыць выразна. Шкада толькі, што ў праграму спевакоў не былі ўключаны творы балгарскай музыкі і рускай опернай класікі. Гэты недахоп часткова выправіў аркестр, які выканаў «Балгарскую рапсодыю» Владзігерава, «Італьянскае капрычыё» Чайкоўскага і «Полькі» з оперы «Прададзеная нявеста» Б. Сметаны.

З поспехам прайшоў выязны канцэрт балгарскіх салістаў з удзелам нашага аркестра ў Бабруйску.

Я. ЦІКОЦКІ,
народны артыст БССР.

На здымку: выступленне **Л. Васілёвай** і **Н. Ніколава.**

Поспех гастролей

Паспяхова праходзяць гастролі Маскоўскага тэатра юнага гледача ў сталіцы Беларусі. Тэатр паказаў рад сваіх спектакляў як для дзяцей, так і для дарослых. Усе спектаклі горача прымаюцца гледачамі. Асабліва добрае ўражанне пакінулі спектаклі «Адвержаныя» Гюго, «Гімназісты» Трэнёва, «Уяўны хворы» Мальера, «Суворавцы» Рыса і Маторына, «Слуга двух паноў» Гальдоні і інш. Кожны новы спектакль выклікае многа думак у гледачоў, якія адзначаюць культуру і ансамблевасць спектакляў.

Артысты тэатра — частыя госці на прадпрыемствах Мінска. Яны ўжо мелі сустрэчы з рабочай моладдзю трактарнага завода, вагонарамонтнага завода імя Мяснікова і інш. Акцёры таксама сустрэліся ў Палацы піонераў з піонерамі і школьнікамі сталіцы. Аб творчым шляху тэатра і яго планах расказалі дырэктар тэатра В. Белаозераў, заслужаныя артысты РСФСР Л. Неўская, П. Гаўрылаў і інш. У заключэнне сустрэчы былі паказаны сцэны са спектакляў.

У дні, калі краіна адзначала 50-годдзе з дня смерці вялікага рускага пісьменніка А. П. Чэхава, артысты выступалі ў канцэртах, якія праводзіліся ў Дзяржаўнай бібліятэцы, бібліятэцы Акруговага Дома афіцэраў і інш.

15 ліпеня адбылася сустрэча артыстаў тэатра з моладдзю Сталінскага раёна горада.

З архіўных матэрыялаў

Зборнік вершаў Я. Аношкі

У Цэнтральнай бібліятэцы імя В. І. Леніна ў Маскве сярод старажытных выданняў мне ўдалося знайсці зборнік вершаў Яна Аношкі, беларускага паэта пачатку XIX стагоддзя. Пра Аношку і яго таленавітыя вершы ўпаміналі некаторыя даследчыкі беларускай літаратуры, аднак нікому з іх не давялося па-сапраўднаму пазнаёміцца з выданнем яго твораў. Нават такія даследчыкі і бібліёграфы, як Р. Друцкі-Падбярэзскі і акадэмік Е. Карскі, не мелі зборніка вершаў Аношкі.

Р. Падбярэзскі ва ўступным артыкуле да выдання Яна Баршчэўскага «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» (1844 г.) гаворыць аб Аношку як аб таленавітым беларускім паэце, які пісаў у народным духу. Даследчык адзначаў, што вершы Аношкі былі вельмі папулярнымі ў Беларусі, часта слухаліся і чыталіся. Ян Аношка «быў чалавек з сапраўдным паэтычным талентам». Тут-жа Падбярэзскі прыводзіць некалькі вершаў Аношкі па ўспамінах Карпінскага і Раймонда Корсака. Упамінае ён і аб зборніку вершаў Аношкі, які быў выдадзены К. Врублеўскай, але адзначае, што выдання гэтага «мы не бачылі», і «таму меркаванне маё аб ім можа быць дачасным». Падбярэзскі далей гаворыць, што па сведчанню сучаснікаў вершы Аношкі «заслугоўваюць назвы народных беларускіх».

У 1866 годзе «Иллюстрированная газета» ў артыкуле «Некалькі слоў аб беларускай народнай паэзіі і аб беларускіх паэтах», падпісаным ініцыяламі Г. Г., пісала аб Аношку наступнае: «У 1836 годзе памёр першы народны паэт Беларусі, у маладых гадах, бедны жабрак, які правёў цэлае жыццё ў вандраваннях ад вёскі да вёскі, не ведаў ні дома, ні родных... Ён марнеў у карчме, і ніхто не пашкадаваў аб яго смерці, ніхто не паведаміў аб ёй. Толькі здабыткі яго рэдкага таленту засталіся да гэтага часу ў памяці народа, які не ведае, каму імі абавязаны. Гэта быў Ян Аношка, сатырык, натхнёны пясняр, які ахапіў у сваіх творах увесь сатырычны і пачуццёвы бок беларускага жыцця. Сатыра яго падобна да простага апавядання, настолькі яна натуральная. Што датычыцца песень Аношкі, на іх зусім справядліва можна глядзець, як на вяршыню яго паэтычнага таленту, такая ў іх глыбіня пачуцця, непадробная захапляючая прастата... На жаль, многія з яго твораў не ўвайшлі ў адзіны, наспех складзены і нявыпраўлены збор яго паэзіі, выдадзены Врублеўскай».

Цяжка сказаць, перад намі гэтае выданне паэтычных твораў Аношкі або другое, таму што на ім не ўказана імя выдаўца. Выданне мае назву: «Паэзія Яна Аношкі. Пасмяротныя творы. На карысць бедных». Кніжка надрукавана ў Полацку, у друкарні Піраў, у 1828 годзе. У ёй 100 старонак, вершы надрукаваны на тонкай, амаль папяросная паперы.

У кароткай прадмове выдавец-жанчына, якая не ўказала свайго прозвішча, піша: «Жывучы некалькі год у раёне Беларускай губерні, я часта чула вершы Яна Аношкі, якога ніколі мне не ўдалося бачыць, як вось у мінулым годзе я даведалася, што яго ўжо няма ў жывых».

Далей аўтар прадмовы паведамляе, што «яго высокасць Нікалай Хрэбніцкі, былы маршалак Лепеля і ордэнскі кавалер, сапраўдны знаўца літаратуры, жадаючы захаваць кожнае зерне народнай творчасці, угаварыў мяне сабраць вершы беларускага паэта і выдаць іх... Я адразу-ж узялася за справу: мясцовыя жыхары адразу пачалі мне прысылаць вершы Аношкі, калі яны іх мелі». Аўтар прызнаецца, што прысланыя ёй вершы Аношкі ў ідэйных адносінах не заўсёды былі такімі, што іх можна было-б надрукаваць без адпаведных паправак. Яна гаворыць, што «папраўкі я рабіла толькі тады, калі пяро паэта, разыйшоўшыся, перайшло свае межы».

У канцы прадмовы пра творы Аношкі сказана, што ў выдаўца «застаўся яшчэ больш за 40 лістоў сшытак, які змяшчаў розныя казкі, байкі, пісьмы вершамі і г. д.».

Лёс гэтых нявыданых твораў Аношкі пакуль невядомы. Знойдзены зборнік яго паэтычных твораў сведчыць аб тым, што гэта быў сапраўды таленавіты паэт-самародак дэмакратычнага кірунку. Нягледзячы на тое, што яго вершы вядомы толькі на польскай мове, самі палякі, як гэта відаць са сказанага вышэй, лічаць Аношку беларускім паэтам. На нашу думку, тая акалічнасць, што творы Аношкі выдадзены на польскай мове, не можа перашкодзіць паэту заняць сваё пэўнае месца ў гісторыі новай беларускай літаратуры таго часу, калі яна толькі пачынала гістарычны шлях свайго развіцця.

Вершы, уключаныя ва ўказаны зборнік твораў Аношкі, — а іх каля шасці дзесяткаў, — няроўнацэнныя як па свайму ідэйнаму зместу, так і па сваёй мастацкай якасці. Большая частка зборніка складаецца з вершаў, якія ўяўляюць сабой гарачыя грамадска-філасофскія маналогі.

З іх перад намі паўстае лірычны вобраз мужнага чалавека, які не баіцца прадявіць рахунак нават самому богу, пагаварыць з ім аб тых непарадках і несправядлівасцях, што маюць месца ў жыцці чалавека.

Асабліва ярка такі матыў гучыць у вершы Аношкі «Чорны адчай», у гэтым абвінаваўчым акце, які выкрывае свет гвалту і прыгнёту, свет несправядлівасці і ашуканства, зайздрасці і злосці.

З вуснаў паэта зрываліся такія словы: «Да гэтага часу ў мяне яшчэ ў сэрцы была надзея, сёння ведаю, што неба з просьбаў маіх смяецца... Свет у маіх вачах — гэта юдоль галечы, клопатаў, працы, прыстанак глупства, злосці, хвароб, турботаў... Побач з раскошай — смутак, бяссілле і клопаты; слава — гэта пустая бурбалка, знешні падман, багацце і служба, калі што-небудзь і даюць, дык кіруе імі несправядлівасць свету — гэтая цэлая махіна здаецца стварэннем гневу».

Адкрытых і непасрэдных выказванняў супраць прыгоннага права ў даным зборніку Я. Аношкі няма. Яны, магчыма, былі выключаны выдаўцом, які сам адзначаў у сваім паведамленні, што ён папраўляў творы паэта. Але, тым не менш, матывы пратэсту супраць сацыяльнага зла, супраць прыгнёту бедных людзей праходзяць праз паэзію Яна Аношкі. У «Скарзе», напрыклад, паэт выступае супраць таго, што ўвесь сацыяльны свет пабудаваны несправядліва; куды-б ён ні паглядзеў, усюды «змрочныя твары відаць»; ён мітусіцца, шукае правільнага шляху і гаворыць: «Сам не ведаю, якім шляхам ісці...», «Схавацца ў вясковай глухамані?», «Але і тут злосны сусед сварыцца, нападае, шкодзіць... Тут мужычок галодны плача». Горад, служба ў судзе, гандаль, манастыр, — куды-б паэт ні заглянуў, усюды ён знаходзіць несправядлівасць, хлусню, прыгнёт, бяспраўнасць. Паэт не можа з гэтым прымірыцца: «Няхай вароты закрыюць, няхай мяне прывяжуць, мая думка і маё сэрца застануцца свабоднымі, мае стогны, куды захочуць, пойдуць... Мае мары я замест праўды рассею, змяшаю мараль са злосцю...».

З вершаў Я. Аношкі мы даведваемся, што аўтар належаў да ліку бедных людзей, яго бацькі не з роду знатных, ён застаўся без бацькоўскай спадчыны.

Біяграфія Яна Аношкі нам пакуль невядома, як застаюцца невядомымі і яго многія творы. Але і тыя з твораў, якія ёсць у нашым распараджэнні, паказваюць, што ў асобе іх аўтара Беларусь у пачатку XIX стагоддзя мела таленавітага паэта, які ўзнімаў свой голас у абарону прыгнечаных і абяздоленых.

Варта было-б выдаць лепшыя вядомыя вершы Яна Аношкі ў перакладах на беларускую мову. Калектыву навуковых работнікаў Інстытута літаратуры і мастацтва Акадэміі навук БССР трэба ўзяцца за пошукі неапублікаваных твораў Я. Аношкі. Магчыма сярод іх знойдуцца творы, напісаныя паэтам на беларускай мове.

М. ЛАРЧАНКА,
дактарант Інстытута сусветнай літаратуры імя Горкага Акадэміі навук СССР.

Сусветная слава

Творы А. П. Чэхава за мяжой

Ва ўсіх краінах свету шырока адзначаецца 50-годдзе з дня смерці вялікага рускага пісьменніка — Антона Паўлавіча Чэхава. Усё прагрэсіўнае чалавецтва лічыць Чэхава вялікім прадстаўніком не толькі рускай, але і сусветнай культуры.

У краінах народнай дэмакратыі Чэхаў выключна папулярны. Буйнейшы кітайскі пісьменнік Лу Сінь указваў на вялікае значэнне Антона Паўлавіча для развіцця кітайскай навелы. У Народным Кітаі выходзяць у свет шматлікія пераклады чэхаўскіх навел, выдаюцца даследчыя работы пра Чэхава. Пачаў выходзіць поўны Збор твораў А. П. Чэхава на кітайскай мове.

У Польшчы, Чэхаславакіі і Балгарыі, Румыніі, Венгрыі і Албаніі творы Чэхава выдаюцца вялікімі тыражамі, ілюстрацыі да іх рыхтуюць лепшыя мастакі. Нядаўна ў Празе была арганізавана выстаўка ілюстрацый да твораў Чэхава. Асобнымі кнігамі там выйшлі яго творы для дзяцей. Друкуюцца поўныя Зборы твораў у Балгарыі, Чэхаславакіі і Румыніі.

У Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы п'есы Чэхава ставяцца амаль ва ўсіх тэатрах краіны. Нядаўна вялікімі тыражамі выдадзена некалькі аднатомнікаў А. П. Чэхава. Выдатныя нямецкія літаратуразнаўцы выпусцілі свае даследванні аб яго творчасці.

Для народаў усіх краін Чэхаў блізкі і зразумелы.

«Сусветны Чэхаў»—так называецца новая англійская кніга Д. Гільдэра. У ёй сабраны вельмі цікавы матэрыял аб папулярнасці Чэхава ў многіх краінах свету. Ды не толькі аб папулярнасці. Пісьменнікі розных краін, якія пішуць на розных мовах, вучацца ў Чэхава майстэрству маленькага апавядання, вучацца праўдзіва перадаваць перажыванні простага чалавека.

«Калі-б не было Чэхава, — пісаў даследчык англійскай навелы Бейц, — гісторыя англійскай літаратуры XX стагоддзя, відаць, пайшла-б па іншаму шляху. Чэхаў навучыў нашых пісьменнікаў глыбока раскрываць псіхалогію чалавека». Амаль тое-ж самае гаворыць амерыканскі літаратуразнаўца Р. Мішо: «Сучасная амерыканская літаратура была-б зусім іншай, калі-б не было чэхаўскага генія».

У кнізе Артура Гейфетса «Чэхаў па-англійску» сабран вялікі матэрыял, які паказвае ўплыў рускага пісьменніка на англійскую і амерыканскую літаратуру. У 30-х гадах у Англіі існавала чэхаўская школа навелістаў, якая выдала некалькі зборнікаў пад назвай «Па шляху Чэхава». Пісьменнікі гэтай школы нават знешне пераймалі Чэхава і часта пераносілі дзеі сваіх навел у Расію.

Вялікі ўплыў Чэхава на англійскую драму і тэатр. «Чэхаў і Станіслаўскі навучылі нас новаму драматычнаму мышленню», — пісаў вядомы англійскі гісторык і драматург Грэнвіль Баркер. Характэрна, што рух за стварэнне пастаянных тэатральных калектываў (да 20-х гадоў такіх у Англіі не было, і акцёры набіраліся асобна для кожнага спектакля) зрабіў Чэхава сваім сцягам. Лепшы англійскі тэатр «Олд Вік» паставіў амаль усе п'есы Антона Паўлавіча.

У Амерыку Чэхаў прыйшоў з Англіі і вельмі хутка заваяваў шырокую папулярнасць. Артур Гейфетс у сваёй кнізе гаворыць аб тым, што навелы Чэхава друкуюцца ў Амерыцы ў самых рознастайных выданнях; ад тоўстых часопісаў да ілюстраваных лісткоў.

Гісторык сучаснага амерыканскага тэатра Кларк надае вялікае значэнне драматургіі Чэхава для перадавых амерыканскіх тэатраў — студэнцкіх, рабочых, аматарскіх.

У Францыі Чэхаў быў вядомы яшчэ ў пачатку 20-га стагоддзя. Таленавіты перакладчык Даніель Рош выдаў збор яго твораў яшчэ да першай сусветнай вайны. Цяпер прагрэсіўнае выдавецтва «Аб'яднанне французскіх выдаўцоў» выпускае новы поўны збор яго твораў. У прагрэсіўным французскім друку часта змяшчаюцца чэхаўскія навелы і артыкулы аб яго творчасці. Нядаўна ў перакладзе вядомай пісьменніцы Эльзы Трыале выйшлі ў свет п'есы Чэхава. Надрукаваны рад новых даследванняў аб яго творчасці. Сярод іх прадстаўляе цікавасць даследванне Андрэ Вюрмстэра «Чэхаў у нашы дні».

Лепшыя італьянскія тэатры — тэатр Мастацтваў у Рыме і Міланскі малы тэатр паставілі некалькі новых спектакляў па п'есах Чэхава «Дзядзя Ваня», «Вішнёвы сад», «Тры сястры», «Чайка». Неапалітанскі тэатр лялек нядаўна паставіў «Вяселле» Чэхава.

У Італіі існуе свая чэхаўская школа навелістаў (Чэзаро Вікі, Леа Ферэро, Каразо Альваро і іншыя). Гэтая група пісьменнікаў лічыць Антона Паўлавіча «выдатным узорам, лепшым прыкладам для наследвання».

У кнізе «Сусветны Чэхаў» Гільдэр расказвае аб выключнай папулярнасці Чэхава ў Поўднёвай Амерыцы, асабліва ў Аргентыне, Мексіцы і Бразіліі. Чэхаўскія апавяданні часта з'яўляюцца ў прагрэсіўным перыядычным друку поўднёва-амерыканскіх краін. Нядаўна «Дзядзя Ваня» і «Вішнёвы сад» пастаўлены на аргентынскай сцэне. У Мексіцы распачата выданне поўнага Збору твораў Чэхава на іспанскай мове.

Алжырская газета «Лібертэ» піша аб папулярнасці Антона Паўлавіча ў Афрыцы. Яго творы выдаваліся тут не толькі на англійскай, галандскай і арабскай мовах, але і на мовах народаў Эфіопіі. Значэнню Чэхава для перадавой арабскай літаратуры прысвечана даследванне совецкага акадэміка Крачкоўскага. Ён піша аб тым, што пад уплывам Чэхава стваралася арыгінальная арабская навела ў Сірыі. Творчасць рускага пісьменніка аказала ўплыў на буйнейшага егіпецкага навеліста Махмед Цеймура, які пераклаў творы Чэхава на арабскую мову.

Усюды з глыбокай павагай і цікавасцю чытаюць і вывучаюць творы вялікага рускага пісьменніка. Вядомы англійскі пісьменнік Д. Галсуорсі так напісаў аб значэнні спадчыны А. П. Чэхава:

«Гэты пісьменнік ведаў вышэйшую праўду пра чалавека, ведаў шляхі раскрыцця чалавечай душы. Таму ён блізкі і зразумелы чытачам усіх народаў».

І. БАРЫСАЎ.

Пісьмо ў рэдакцыю

„Месцаў няма..."

Світае. Ледзь-ледзь пачынае рассявацца начны змрок, і грамадзяне, што прыехалі з розных раёнаў рэспублікі ў Мінск, сталіцу Беларусі, з партфелямі, паходнымі сумкамі і чамаданамі спяшаюцца да гасцініц «Беларусь» і «Першая совецкая».

Вось «Першая совецкая» гасцініца. Адзін за другім падыходзяць да акенца дзяжурнага адміністратара прыезджыя:

— Мне, калі ласка, ложак, ды як-бы хутчэй, бо вельмі-ж стаміўся.

— А мне нумар, ды з душам! — раздаецца з-за спіны чыйсьці голас.

Дзяжурны адміністратар, нават не павярнуўшы ў бок прыбыўшых людзей галавы, абыякава кідае:

— Месцаў няма! — і, крыху памаўчаўшы, дадае. — І не будзе.

— Дык як-жа быць? Дзе-ж спыніцца?

— Дзе хочаце! Месцаў няма!

— Дайце кнігу скарг!

— Няма. У дырэктара на праверцы, — адказвае дзяжурны адміністратар тав. Клябко.

У гаворку ўмешваюцца тэхнічныя работнікі гасцініцы.

— Месцаў сапраўды няма. Але чаму ў гасцініцы пастаянна пражываюць дваццаць пяць чалавек? Вось былі-б і месцы для прыезджых.

Адміністратар злосна паглядзела на іх і, нічога не сказаўшы, села за стол. А ў гэты час у вестыбюлі ў крэслах сядзелі людзі.

Такі «ветлівы» прыём чакае наведвальнікаў мінскіх гасцініц кожны дзень. Такую «асалоду» адчуў і я ў час пошукаў месца ў гасцініцы ў мінулым годзе. Становішча не змянілася і сёлета.

Гэта — сур'ёзны папрок у адрас Мінскага гарадскога совета. Час, нарэшце, выселіць з гасцініцы пастаянных жыхароў і як належыць абслугоўваць камандзіровачных людзей.

С. ПАСЬ,
выкладчык Шчэдрынскай сярэдняй школы Парыцкага раёна.

Галоўны рэдактар Васіль ВІТКА.

Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Дзмітрый АРЛОЎ, Уладзімір АЛОЎНІКАЎ, Алесь БАЧЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Васіль БУРНОСАЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Ірына ЖДАНОВІЧ, Павел КАВАЛЕЎ, Барыс ПЯРКОЎСКІ.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, Совецкая, 34. Тэлефоны: галоўнага рэдактара і намесніка галоўнага рэдактара 2-31-94, адказнага сакратара 2-32-04, аддзелаў літаратуры, мастацтва і публіцыстыкі 2-14-94, выдавецтва і бухгалтэрыі 2-54-45.

АТ 04458. Друкарня «Чырвоны Друкар», Мінск, Рэволюцыйная, 12.